

Усё толькі пачынаецца

СТАР. 3



Прыгатуем, можа, цымес...

СТАР. 6



З чым вярнуўся Тэа?

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 МАЯ 2014 г. АЎТОРАК № 91 (27701) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЦІ ЎСЕ ПРАЦУЮЦЬ ЗЛАДЖАНА?

### Прэзідэнт заслухаў даклад аб сітуацыі падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі

Кіраўнік дзяржавы, у прыватнасці, пацікавіўся пытаннямі бяспекі, медыцынскага забеспячэння і далейшымі перспектывамі выступлення беларускай зборнай на гэтым першынстве, паведамляе БЕЛТА.

Прэзідэнт запатрабаваў далажыць яму аб арганізацыйным баку правядзення чэмпіянату свету. «Як арганізавана мерапрыемства? Ці ёсць прэтэнзіі, пытанні ў гэтым плане?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. Асобна Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на пытаннях медыцынскага абслугоўвання гасцей сусветнага першынства. Таксама кіраўнік дзяржавы пацікавіўся сітуацыяй бяспекі пры правядзенні чэмпіянату, тым, як працуе міліцыя і іншыя спецыяльныя службы.

Адказныя асобы далажылі кіраўніку дзяржавы, што ў цэлым усе службы працуюць на чэмпіянаце зладжана. Як адзначыў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, няма ніякіх праблем ні з размяшчэннем удзельнікаў і гасцей чэмпіянату, ні з харчаваннем, ні з медыцынскім абслугоўваннем, ні з транспартным забеспячэннем. Паводле яго слоў, па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць, аператыўна прымаюцца рашэнні ў залежнасці ад існуючай сітуацыі.

Падводзячы вынікі нарады, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на добрую арганізацыю, у той жа час падкрэсліўшы, што наперадзе яшчэ асноўныя гульні чэмпіянату. «Гэта асноўныя дні, і на гэтыя дні прыедуць заўзятыя балельшчыкі і спецыялісты, — сказаў Прэзідэнт. — Таму ўсё павінна быць даведзена да розуму. І не дапускаць ні ў якім выпадку залішняга росту цэн. Таму што ўсё можам змазаць у апошнія дні».

## ДЗЕЛЯ ГУМАННАЙ МЭТЫ

### Беларусь зацікаўлена ў адкрыцці ў краіне рэгіянальнага цэнтра перадавога вопыту ў галіне абароны ад хімічнай зброі

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з гендырэктарам Арганізацыі па забароне хімічнай зброі (АЗХЗ) Ахметам Узюмджу, паведамляе БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі асабліва падкрэсліў той факт, што Арганізацыя па забароне хімічнай зброі атрымала Нобелеўскую прэмію. «Я лічу, што гэтая прэмія заслужаная, таму што вы і ваша арганізацыя, напэўна, упершыню ў гісторыі зрабілі такі маштабны крок па знішчэнні хімічнай зброі. Мы заўсёды супрацоўнічалі і будзем супрацоўнічаць з вашай арганізацыяй (нашай арганізацыяй, паколькі мы з'яўляемся яе членамі). Мы прыхільнікі міжнароднай канвенцыі па забароне хімічнай зброі, і тут вы можаце разлічваць на нашу падтрымку і дапамогу», — сказаў беларускі лідар.

«Мы з'яўляемся прыхільнікамі прасоўвання інтарэсаў арганізацыі на тэрыторыі Беларусі і хацелі б, каб рэгіянальнае аддзяленне гэтай арганізацыі існавала ў Беларусі. Мы зробім усё неабходнае, калі падобнае рашэнне будзе прынята, каб тут было камфортна працаваць спецыялістам, якія будуць займацца пытаннямі, звязанымі са знішчэннем і забаронай хімічнай зброі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што з боку АЗХЗ да Беларусі ніколі не было прэтэнзій і заўваг да работы хімічных і нафтахімічных прадпрыемстваў краіны. «Хачу вас запэўніць, што такі ж узровень працы нашых прадпрыемстваў будзе і надалей», — запэўніў беларускі лідар.

У сваю чаргу, Ахмет Узюмджу падкрэсліў высокі ўзровень узаемадзеяння АЗХЗ і Беларусі.

## Да канца чэрвеня з Сірыі вывезуць усю хімічную зброю

**На сустрэчы з міністрам замежных спраў нашай краіны Уладзімірам Макеем генеральны дырэктар Арганізацыі па забароне хімічнай зброі (АЗХЗ) Ахмет Узюмджу падкрэсліў, што Беларусь робіць важны ўнёсак у выкананне Канвенцыі па забароне хімічнай зброі.**

Ахмет Узюмджу заўважыў, што высока ацэньвае дзейнасць Беларусі ў рамках Арганізацыі па забароне хімічнай зброі. Ён паведаміў, што каля 80 прадстаўнікоў Беларусі прынялі ўдзел у розных яе мерапрыемствах.

Адной з самых важных сённяшніх місій АЗХЗ, у якой прымае актыўны ўдзел і наша краіна, з'яўляецца вываз і знішчэнне хімічнай зброі, што знаходзіцца ў Сірыі.

— Большая частка ўсёй хімічнай зброі, што знаходзілася ў Сірыі, ужо загружана на два караблі, якія прадставілі Данія і Нарвегія, — расказаў генеральны дырэктар арганізацыі. — Тая хімічная зброя, што засталася ў Сірыі, знаходзіцца на тэрыторыі са складанымі ўмовамі бяспекі. Мы спадзяёмся, што ў бліжэйшы час улады Сірыі забяспечаць доступ да гэтых матэрыялаў і іх адгрузку.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## ПРЫЙСЦІ, КАБ ВЯРНУЦЦА





*Скульптурная кампазіцыя «Гарадскія шалі», што на плошчы Свабоды, стала любімым месцам гараджан і гасцей сталіцы. Асабліва людна каля помніка ў гэтыя хакейна-святочныя дні. Па даўняй традыцыі, каб зноў вярнуцца ў любімае месца, кідаюць манеты — у фантаны, рэкі і нават акіяны. Паколькі ў Беларусі манет няма, мінскія шалі сталі своеасаблівай скарбонкай для папяровых грошай.*

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*ЛІЧБА ДНЯ*

***Br4 млн 118 тыс.***

***у месяц склаў у першым квартале гэтага года ў разліку на душу насельніцтва аб'ём грашовых даходаў. Асноўнымі крыніцамі фарміравання грашовых даходаў насельніцтва з'яўляюцца аплата працы і трансферты (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя выплаты), удзельная вага якіх у агульным аб'ёме грашовых даходаў у першым квартале гэтага года склала 84,6%. Рэальныя наяўныя грашовыя даходы (грашовыя даходы за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэктаваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені — сакавіку 2014 года ў параўнанні са студзенем — сакавіком 2013-га павялічыліся на 6,6%.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10030,00 | ■ |
| Еўра | 13760,00 | ■ |
| Рас. руб. | 288,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 834,10 | ▲ |

■ Гэта — шанц

## «ПУСЦІЦЬ КАРАНІ» Ў АНТАРКТЫДЗЕ! ПАКУЛЬ НЕ ПОЗНА...

**Прысутнасць беларускіх палярнікаў у Антарктыдзе і ўзвядзенне на ледзяным кантыненце сваёй палярнай станцыі мае для нашай краіны геапалітычнае значэнне. Падчас урачыстага прыёму, які арганізавалі ў Нацыянальнай акадэміі навук у гонар удзельнікаў шостай Беларускай антарктычнай экспедыцыі, гэтая думка рэфрэнам гучала літаральна ва ўсіх выступленнях.**

### АДНА НА ЎСІХ

Гісторыя вандровак беларускіх навукоўцаў на Паўднёвы полюс Зямлі распачалася яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя: пачынаючы з 1956 года, нашы даследчыкі прысутнічалі ў складзе амаль усіх савецкіх антарктычных экспедыцый. Але затым вялікая краіна распалася, і ў гісторыі суверэннай Беларусі вяртанне беларусаў у Антарктыду адбылося ўжо ў 2006 годзе. Сёння знаходжанне беларусаў у Антарктыцы магчымае толькі дзякуючы падтрымцы расійскіх калег. Беларускія навукоўцы адпраўляюцца на ледзяны кантынент у складзе расійскіх антарктычных экспедыцый і базіруюцца там на расійскіх палярных станцыях. Даследаванні праводзяцца, пастаўленыя навуковыя задачы выконваюцца... Але абсалютна ўсе ўпэўнены, што наяўнасць сваёй палярнай станцыі — гэта выхад на прынцыпова новы ўзровень.



Фота БЕЛТА.

**Удзельнікі шостай Беларускай антарктычнай экспедыцыі Юрый Гігіняк, Аляксей Гайдашоў і Ілья Бручкоўскі.**

— Цікаўнасць да кантынента праяўляюць вельмі многія краіны. Упэўнены, што пройдзе ўсяго 20–30 гадоў і забарона на выкарыстанне прыродных рэсурсаў Антарктыды будзе знята. Пытанні аб размежаванні зон уплыву на кантыненце абавязкова паўстануць. І толькі калі ў нас будзе свая станцыя, мы зможам паўдзельнічаць у падзеле агульнага «пірага», — выказаў сваё меркаванне **акадэмік Уладзімір ЛОГІНАЎ,** які стаяў ля вытокаў стварэння беларускай арктычнай праграмы. — А калі не знойдзем на яе сродкі, то, напэўна, дарма калісьці ўсё распачыналі...

СТАР. 2

■ Надвор'е

## Майская спякота: плюс 30, моцныя ліўні і нават град

**З першых дзён тыдня на тэрыторыі нашай краіны захаваецца ўплыў вельмі цёплых паветраных мас, якія завіталі да нас з боку поўдня еўрапейскай Расіі, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму спякота будзе ў нас на працягу ўсяго тыдня. Аднак сёння ў большасці раёнаў чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы, а месцамі магчымы нават моцныя ліўні. У асобных раёнах — шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с, а часам магчымы град. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 24–29 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны прыгрэе да 30 цяпла. Толькі ў заходніх раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей будзе крыху свяжэй — плюс 21–23 градусы. У ноч на 21 мая месцамі, а ўдзень паўсюдна пройдуць непрацяглыя дажджы, месцамі навальніцы, а ўдзень зноў магчымы град. Тэмпература ў ноч на сераду складзе плюс 10–17, удзень — 20–27 цяпла. У другой палове тыдня атмасферны ціск пачне павялічвацца, аднак у чацвер і пятніцу месцамі чакаюцца невялікія дажджы і навальніцы. Уначы ў гэтыя дні 10–17 цяпла, удзень у чацвер — плюс 21–28 градусаў, у пятніцу — 23–29 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя стане яшчэ цяплей. Уначы будзе плюс 12–18 градусаў, удзень прыпячэ да плюс 24–30 градусаў. Будзе даволі сонечна, бо кароткачасовыя дажджы прагназуюцца толькі ў асобных раёнах. Месцамі магчымы навальніцы.

**Сяргей КУРКАЧ**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### СЛАВАКІЯ ПАЧАЛА ПАДРЫХТОЎКУ ДА РЭВЕРСНЫХ ПАСТАВАК ГАЗУ ВА УКРАІНУ

Славакія прыступіла да падрыхтоўкі трасы для рэверсных паставак газу ва Украіну. Адпаведную заяву ў панядзелак зрабіў міністр замежных спраў краіны Міраслаў Лайчак пасля сустрэчы з кіраўніком расійскага МЗС Сяргеем Лаўровым. На думку славацкага міністра, такія пастаўкі з'яўляюцца нармальнымі і карыснымі. Галоўнае — не дапусціць парушэнняў ужо існуючых дамоўленасцяў. Са свайго боку, Лаўроў заявіў, што дзеянні Славакіі не супярэчаць дасягнутым дамоўленасцям з Расіяй, а таму ў расійскага боку няма ніякіх прэтэнзій. Доўг Украіны перад Расіяй за газ на сёння складае 3,5 мільярда долараў. Кіеў адмаўляецца плаціць, паколькі не прызнае яго памер.

### ВУЧОНЫЯ АСПРЭЧЫЛІ КАРЫСЦЬ ЧЫРВОНАГА ВІНА І ШАКАЛАДУ



Даследаванне групы амерыканскіх і італьянскіх навукоўцаў паказала, што антыаксідант рэсвератрол, які змяшчаецца ў чырвоным віне, ягадах і шакаладзе, не ўплывае на працягласць жыцця чалавека і не зніжае рызыку ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў і раку. Вынікі даследавання апублікаваны ў часопісе JAMA Internal Medicine. Рэсвератрол змяшчаецца ў шакаладзе, арахісе, вінаградзе і некаторых відах садавіны. Шырока распаўсюджана меркаванне аб тым, што гэты антыаксідант здольны запавольваць працэсы старэння і зніжаць рызыку сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў. Так, згодна з апублікаваным летась даследаваннем, праведзеным навукоўцамі Гарвардскага ўніверсітэта і Нацыянальных інстытутаў аховы здароўя ЗША, рэсвератрол можа запавольваць старэнне ў мышэй. Аднак новае даследаванне не выявіла ўзаемасувязі паміж ужываннем у ежу прадуктаў, якія змяшчаюць рэсвератрол, і здароўем чалавека. Праўда, навукоўцы не спяшаюцца адмяняць ранейшыя рэкамендацыі: людзям у любым выпадку карысна есці многа садавіны і гародніны.

ISSN 1990 - 763X

14091

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ШВЕЙЦАРЦЫ АДМОВІЛІСЯ АД «МІНІМАЛКІ» Ў $4,5 ТЫС.

18 мая ў краіне прайшоў агульнанацыянальны рэферэндум, на якім вырашалася пытанне аб увядзенні ў Швейцарыі мінімальнай зарплаты ў $25 у гадзіну, што раўназначна амаль $4,5 тыс. у месяц.

Паводле папярэдніх даных, швейцарцы не прынялі гэтую прапанову. Ініцыятыва ўпершыню ў гісторыі краіны ўвесці «мінімалку» належала прафсаюзам, якія сцвярджалі, што гэта неабходна для годнага ўзроўню жыцця людзей. Гэта толькі на першы погляд зарплата ў $4,5 тыс. у месяц здаецца высокай. Прафсаюзы заяўлялі, што ў Швейцарыі пражыць на гэтую суму нялёгка: у краіне вельмі высокія цэны на жыллё, медыцынскае страхаванне і прадукты харчавання.

Праціўнікі новаўвядзення сцвярджалі, што гэтыя меры прывядуць да росту беспрацоўя сярод моладзі, бо павялічаць выдаткі вытворчасці. Прапанаваная зарплата ў $4,5 тыс. — гэта толькі дзве трэці ад сярэдняй зарплаты, якую сёння атрымліваюць швейцарцы.

КОРАТКА

У тройку самых папулярных беларускіх музеяў у 2013 годзе ўвайшлі Нясвіжскі замак, Брэсцкая крэпасць і палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі.

Пасажыры, якія вылятаюць з Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», будуць выплачваць збор на развіццё інфраструктуры аэрапорта. З тых, каму ўжо споўнілася 12 гадоў, будзе спаганяцца плата ў памеры $5, а каму ад 2 да 12 гадоў — у памеры $2,5.

У Вене прынята ініцыіраваная Беларуссю рэзалюцыя «Папярэджанне і барацьба з незаконным абаротам органаў і гандлем людзьмі ў мэтах атрымання органаў».

Адзін з бліжэйшых саратнікаў Папы Рымскага сакратар Кангрэгацыі евангелізацыі народаў салезіянец архібіскуп Савіа Хон Тай-Фай узначаліць службу ў мінскім архікафедральным касцёле імя Прасвятой Дзевы Марыі.

За мінулыя выхадныя за парушэнне правіл дарожнага руху да адказнасці прыцягнуты 1372 пешаходы, з іх 455 за адсутнасць святловяртальных элементаў у цёмны час сутак.

■ Кампетэнтна

## АПТЫМІЗАЦЫЯ ДЛЯ АПТЫМІСТАЎ



### У Мінскай вобласці другі год працягваецца аптымізацыя ў сферы культуры. Хто выйграў ад новаўвядзенняў?

**Пра гэта і многае іншае размова з першым намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святланай БАРАНОК.**

**— Святлана Аляксандраўна, аптымізацыя сістэмы культуры пачалася не ўчора і не сёння, яна была актуальнай на працягу многіх гадоў. Ці не так?**

— За 15 гадоў колькасць устаноў культуры на Міншчыне скарацілася на 28,8%, а за апошнія пяць гадоў — на 15,2%. Інакш, гэты працэс ішоў пастаянна, без указанняў зверху, без даведзеных паказчыкаў, і паскорыўся са стварэннем аграгарадкоў. У сваю чаргу, мы імкнуліся ўзбуйніць, максімальна ўзмацніць, аснасціць матэрыяльна-тэхнічную базу дамоў культуры і бібліятэк гэтых буйных цэнтраў за кошт аптымізацыі ўстаноў культуры, што знаходзіліся ў малакалькасных населеных пунктах. На працягу мінулага года, калі дзяржава афіцыйна аб'явіла аптымізацыю бюджэтных расходаў ва ўсіх сферах, у сістэме культуры Мінскай вобласці колькасць устаноў зменшылася на 5,9%.

Бясспрэчна, сутыкаемся і з праблемамі. У прыватнасці, у многіх сельскіх установах культуры ў штаце 2–3, максімум 4 супрацоўнікі. Скараціўшы хаця б аднаго з іх, мы пагаршаем даступнасць культурных паслуг для насельніцтва. Ёсць у нас і невялікія бібліятэкі, дзе ў адной асобе і дырэктар, і прыбіральшчыца. Мы не можам проста скасаваць штатную адзінку без закрыцця самой установы. Таму імкнёмся выпрацаваць такі механізм, каб не нашкодзіць спажыўцам паслуг.

СТАР. 5

■ АПК: праблемы і рашэнні

# ВЁСКА ДАЗВАЛЯЕ БАГАЦЕЦЬ

## ЧАМУ ГЭТА НЕ ВА ЎСІХ АТРЫМЛІВАЕЦЦА?

**Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь,** які курыруе аграпрамысловы комплекс, падчас нарады ў старажытным Полацку падкрэсліў, што з-за адсутнасці дысцыпліны, у выніку халатнасці, бязладнасці і іншых прычын аграрыі краіны недаатрымліваюць гіганцкія сумы — больш як 11 трыльёнаў рублёў. А **Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь,** нагадаў, што Беларусь, калі стане членам Сусветнай гандлёвай арганізацыі, павінна будзе «адкрыць межы» для іншаземных прадуктовых тавараў. Да гэтага трэба быць гатовымі, каб айчыннае было канкурэнтаздольным.

Галоўная думка, якая стала «дэвізам» нарады: трэба навучыцца правільна працаваць на зямлі, даглядаць жывёлу, лепш перапрацоўваць сельскагаспадарчую прадукцыю, каб больш зарабляць.

— Наша задача — забяспечыць дабрабыт людзей, якія працуюць у аграпрамысловым комплексе, — а значыць, даць магчымасць атрымліваць годны заробак. Трэба людзей накарміць, прамысловасць забяспечыць неабходнай сыравінай, а лішкі прадукцыі выгадна рэалізаваць на экспарт, каб атрымаць валюту. Шмат чаго зроблена ў пытанні развіцця аграпрамысловага комплексу. Але што не ўдалося, што перашкаджае, куды нам трэба далей рухацца — гэтыя пытанні трэба абмеркаваць, — звярнуўся віцэ-прэм'ер да прысутных на нарадзе.

Ён канстатаваў, што ў цэлым па краіне выдаткі на аграпрамысловую вытворчасць перавышаюць выручку ад рэалізаванага. Дэфіцыт склаў 33 трыльёны рублёў.

Што тычыцца Віцебшчыны, на жаль, аграрны комплекс, мякка кажучы, пакуль што не перадавы. Як расказаў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц, у большасці раёнаў сельская гаспадарка стратная. 12% гаспадарак фармуюць палову выручкі.

— А выручка на работніка ў 16 раёнах ніжэйшая за сярэднеабласны ўзровень. Паказчыкі па эканамічнай эфектыўнасці не ўражваюць, — адзначыў міністр.

Безумоўна, у міністэрстве, ва ўрадзе зробяць усё магчымае, каб на айчыннай сельскай гаспадарцы не быў, фігуральна кажучы, пастаўлены крыж. Тым больш, што аграрыі летась прыемна здзівілі: экспартавалі лішкаў на рэкордную суму — 5,8 мільярда долараў. І, вядома, беларусаў галоднымі не пакінулі.

**Аляксандр КОСІНЕЦ, старшыня Віцебскага аблвыканкама,** расказаў, што многае зроблена для таго, каб аграрны комплекс самага паўночнага рэгіёна краіны выйшаў на новы ўзровень:

— Уявіце, прыкладна 5 гадоў таму ў нас было 488 фермаў з даеннем «у вядро», а ва ўсёй краіне — каля 550. Да 1 верасня такіх фермаў наогул не будзе. Былі на апошнім месцы па машынна-трактарным парку. Цяпер па збожжаўборачнай і кормаўборачнай тэхніцы выйшлі на ўзровень іншых рэгіёнаў. На 2,7 трыльёна рублёў купілі ўгнаенняў. Кармы больш не завозім з іншых абласцей.

Паводле слоў губернатара Віцебшчыны, будучыня — за буйнатаварнай вытворчасцю. Трэба, каб за кожнай гаспадаркай было замацавана 7 тысяч гектараў зямлі.

Вядома, што кадры вырашаюць усё. На Віцебшчыне іх не хапае. Літаральна на вагу золата кожны кіраўнік гаспадаркі, добрасумленны работнік. Наконт маленькіх заробкаў міністр сельскай гаспадаркі адзначыў, што ў Беларусі ёсць прыклады, калі старшыні сельгаспрадпрыемстваў зарабляюць па 30 мільёнаў рублёў у месяц, а аб зарплаце радавых вяскоўцаў могуць толькі марыць гараджане. Трэба толькі эфектыўна працаваць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Полацк — Віцебск.*

# «ПУСЦІЦЬ КАРАНІ» Ў АНТАРКТЫДЗЕ!..



(Заканчэнне. Пачатк на 1-й стар.)

— Мы ідзём у Антарктыду не толькі па навуку. Краіна прыходзіць у Антарктыку, каб абазначыць там сваю прысутнасць. Гэта работа на перспектыву, для атрымання ў будучым эканамічных дывідэндаў для нашай краіны, — упэўнены **начальнік шостай Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей ГАЙДАШОЎ.** — Калі-небудзь абавязкова паўстануць пытанні: а хто тут быў раней, чым займаўся, які ўклад унёс у вывучэнне і засваенне кантынента? Наша краіна павінна заявіць пра сябе як пра паўнапраўнага ўдзельніка засваення Антарктыкі.

Падчас апошняй экспедыцыі, якая доўжылася больш чым паўгода, беларускія палярнікі праводзілі даследаванні па пяці навуковых кірунках. Многія з беларускіх прыбораў, што праходзілі палявыя выпрабаванні, больш танныя за свае замежныя аналагі. Разам з тым, яны маюць больш шырокі дыяпазон рабочых характарыстык. Сярод іх — прыбор, які дазваляе ажыццяўляць каліброўку оптыкі штучных спадарожнікаў Зямлі з зямной паверхі. Для гэтага адсочваўся графік праходжання над тэрыторыяй Антарктыды беларускага касмічнага апарата. Тэсціраваўся сродак для ліквідацыі забруджвання нафтапрадуктамі. Шмат праводзілася біялагічных даследаванняў. Пакуль што ўсе здабытыя ў Антарктыцы ўзоры яшчэ знаходзяцца па дарозе ў Беларусь. А калі яны будуць дастаўлены, распачнецца сур'ёзная работа па аналізе атрыманых даных.

## ШКОЛА ВЫЖЫВАННЯ

— Прафесіяналізм і адказнае стаўленне да сваёй справы ў Антарктыдзе, безумоўна, важныя, — прызнаецца Аляксей Гайдашоў, — але галоўнае ва ўмовах ізаляцыі ад Вялікай зямлі ўсё ж — поўная псіхалагічная сумяшчальнасць удзельнікаў экспедыцыі, іх кантактнасць і камунікабельнасць. Каб можна было цалкам палажыцца на чалавека, што знаходзіцца побач з табой. У нас склалася цудоўная каманда, таму, напэўна, мы не толькі выканалі, але і перавыканалі пастаўленыя перад намі задачы…

Кампанію Аляксею Гайдашову склалі **інжынер-эколаг Навукова-вытворчага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Юрый ГІГІНЯК** і **інжынер-геафізік Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ Ілья БРУЧКОЎСКІ.** Але калі Аляксей Гайдашоў і Юрый Гігіняк — ужо вопытныя палярнікі, то для Ільі досвед па выжыванні ў суровых палярных умовах быў новым. «Перш чым замахнуцца на Антарктыду, трэба прайсці «школу выжывання» Аляксея Гайдашова», — усміхаецца начальнік экспедыцыі. Ілья, напэўна, «экзамен» прайшоў, таму і атрымаў магчымасць пратэсціраваць у экстрэмальных умовах уласна сканструяваны прыбор.

Кожны з беларускіх палярнікаў — цікавая асоба. Адчуваецца, што Юрый Гігіняк можа расказваць пра сваё захапленне Антарктыкай гадзінамі:

— Нас цікавяць арганізмы, якія жывуць у моры пры мінус два. Цікавяць імхі і лішайнікі, што жывуць на скалах. Гэта старажытнейшыя арганізмы. Ім дзесяць тысяч гадоў. За кошт чаго яны выжылі ў экстрэмальных кліматычных умовах? Дыназаўры вымерзлі, а гэтыя арганізмы жывуць! А ці ведаеце вы, што 50 відаў флоры і фаўны, якія мы знайшлі ў Антарктыдзе, ёсць і ў Беларусі?

## БЫТАВЫ КАМФОРТ І НАВУКА

Адметнасцю апошняй шостай экспедыцыі стаў новы яе фармат.

— Традыцыйна мы працавалі ў палявым лагеры каля гары Вячэрняя, на старой інфраструктуры, створанай яшчэ ў савецкія часы. Там пытанні жыццезабеспячэння займаюць у каманды 60–70% усяго часу. І толькі 30–40% застаецца непасрэдна на навуку, — расказаў Аляксей Гайдашоў. — На гэты раз нам было з чым параўноўваць. Мы працавалі на новай сучаснай расійскай станцыі, якая была толькі тры гады таму ўведзена ў эксплуатацыю. Станцыя «Прагрэс» аснашчана па апошнім слове тэхнікі і адпавядае ўсім патрабаванням да работы ў палярных умовах. Гэта камфортныя бытавыя ўмовы, добрая арганізацыя харчавання, наяўнасць інтэрнэту, няхай і з невялікай хуткасцю. У нас быў спадарожнікавы канал тэлебачання. І там наш час размяркоўваўся зусім іншым чынам: 70% — на навуку і толькі 30% — на «бытавыя» пытанні.

Аляксей Гайдашоў спадзяецца, што 2014 год стане для беларускай навукі вызначальным. Па самым аптымістычным сцэнарыі, першы модуль беларускай антарктычнай станцыі можа быць дастаўлены ў Антарктыду ўжо ў лістападзе. Канцэптуальны праект беларускай палярнай станцыі і экалагічнае яе абгрунтаванне (ацэнка ўздзеяння станцыі на навакольнае асяроддзе) у пачатку мая былі прадстаўлены на кансультатыўнай нарадзе краін — удзельніц міжнароднага дагавора аб Антарктыцы. Ацэнка была падрыхтавана сумеснымі намаганнямі супрацоўнікаў Цэнтра палярных даследаванняў, Інстытута прыродакарыстання і Цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук. З боку замежных экспертаў прагучалі пэўныя заўвагі, якія давядзецца ўлічваць, але прынцыповых пярэчанняў не было. Калі б прагучаў хоць бы адзін голас супраць, то шанцаў у беларусаў не было б.

## КАМПАКТНАЯ, ЗАТОЕ — СВАЯ

У параўнанні з палярнай станцыяй, разлічанай на адначасовае знаходжанне там 80 чалавек, на якую замахнуліся кітайцы, беларуская станцыя будзе вельмі кампактнай і нават мініяцюрнай. Яна будзе складацца з модуляў памерам з марскі кантэйнер і збірацца як канструктар. Усе модулі — айчыннай вытворчасці. Прадугледжаны аўтаномнае энергазабеспячэнне кожнага модуля (гэта значыць, што ў кожным модулі будзе свой генератар на аварыйныя выпадкі), клімат-кантроль, сістэма сувязі паміж модулямі, навігацыйныя сістэмы. Але самае галоўнае — модулі не патрабуюць капітальнага будаўніцтва. Плануецца, што з борта карабля яны верталётам будуць дастаўляцца на ўзбярэжжа і для іх устаноўкі не спатрэбяцца ні краны, ні бульдозеры. Да таго ж станцыя лёгка дэманціруецца.

— У апошнюю нашу экспедыцыю праводзілася пазапланавая работа — дэталёвае азнаямленне з работай экалагічнай службы расійскай станцыі «Прагрэс». Будзем браць у калег лепшае і не дапускаць чужых памылак, — палічыў патрэбным удакладніць Аляксей Гайдашоў.

**Галоўнае ва ўмовах ізаляцыі ад Вялікай зямлі — поўная псіхалагічная сумяшчальнасць удзельнікаў экспедыцыі, іх камунікабельнасць.**

Будаўніцтва першай чаргі беларускай антарктычнай станцыі запланавана на 2014–2018 год. Маюцца на ўвазе некалькі лабараторна-жылых модуляў, сістэма жыццезабеспячэння і сістэма залпавага скідвання бытавых сцёкавых вод у марскую акваторыю, што дапускаецца пры пэўнай колькасці членаў экспедыцыі (да 30 чалавек) і сезонным рэжыме работы. А глабальныя збудаванні ў выглядзе нафтабазы, ачышчальных збудаванняў пастаяннага замкнутага цыкла запланаваны на другі этап — з 2018 па 2025 год.

Сёння да міжнароднага дагавора па Антарктыдзе далучылася ўжо 61 дзяржава. З іх 31 мае ўласныя антарктычныя станцыі і базы, а 18 краін маюць дзве і больш уласных станцый. Ці папоўніць іх шэрагі Беларусь? Пытанні пакуль застаюцца… Дзяржаўная праграма маніторынгу палярных раёнаў Зямлі і забеспячэння дзейнасці арктычных і антарктычных экспедыцый на 2011–2015 гады патрабуе фінансавых карэкціровак, у тым ліку і па колькасці членаў экспедыцый. Палярнікі смяюцца: маўляў, свой повар, як і медык, быў бы вельмі дарэчы. Меркавалася, што колькасць членаў нацыянальных экспедыцый будзе пяць чалавек, але з-за тэхнічнай памылкі пры афармленні дакумента замест пяці чалавек засталіся тры. Спадзяёмся, што памылка будзе выпраўлена.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## САМАЛЁТ З БЕЛАРУСКАЙ ГУМАНІТАРНАЙ ДАПАМОГАЙ ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў БЯЛГРАДЗЕ

**У Бялград, паведаміў БЕЛТА прэс-сакратар МНС Віталь Навіцкі, дастаўлены мотапомпы, дызельныя электрастанцыі, электрагенератары, каркасныя палаткі, коўдры, прадукты харчавання. У бліжэйшыя гадзіны, па рашэнні сербскага боку, гуманітарная дапамога будзе перададзена пацярпеламу ў выніку паводкі насельніцтву краіны.**

«Сербскі бок звярнуўся з просьбай аказаць падтрымку выратавальнікамі, тэхнікай і абсталяваннем для ліквідацыі наступстваў прыроднай катастрофы. Па распараджэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, два верталёты Мі-8 авіяцыі МНС і чатыры групы выратавальнікаў у нядзелю раніцай вылецелі ў Сербію», — сказаў Віталь Навіцкі. Ён таксама адзначыў, што беларускія спецыялісты аснашчаны ўсім неабходным абсталяваннем для дапамогі людзям ва ўмовах паводкі. Зараз верталёты знаходзяцца ў Сербіі, супрацоўнікі МНС гатовы прыступіць да выканання задач па выратаванні і эвакуацыі людзей, дастаўцы прадуктаў харчавання і абсталявання.

Моцныя паводкі ў Сербіі, выкліканыя вялікай колькасці ападкаў, прывялі да негатыўных наступстваў у шасці раёнах паўднёвай часткі краіны. Блакіраваны дарогі, пашкоджаны сеткі водазабеспячэння, не працуе мясцовая прамысловасць. Па прагнозах спецыялістаў, узровень вады ў рацэ Вялікая Морава і большасці яе прытокаў у бліжэйшы тыдзень таксама будзе нашмат перавышаць небяспечную адзнаку.

## АЛЕІ З КВЕТКАМІ ЎЗДЫМУЦЬ НАСТРОЙ

**Гомельшчына заўсёды мела і падтрымлівае імідж вельмі чыстага і прыгожага рэгіёна Беларусі, адзначае начальнік галоўнага ўпраўлення справамі Гомельскага аблвыканкама Алена КЛІЧКОЎСКАЯ:**

— Неаднаразова горад Гомель займаў першае месца ў рэспубліцы па добраўпарадкаванні. У сувязі з чэмпіянатам свету па хакеі асаблівую ўвагу надаём добраўпарадкаванню (у тым ліку ўсіх райцэнтраў) — у прыватнасці вертыкальнаму азеляненню. Гомельскі палацава-паркавы ансамбль радуе наведвальнікаў: алеі з кветкамі ў нас не горш, чым у Галандыі.

Не так даўно на Гомельшчыне былі адкрыты Лядовы палац і Палац водных відаў спорту. Там вельмі любяць трэніравацца расійскія спартсмены. Падчас чэмпіянату свету гэтыя аб'екты карыстаюцца вялікай папулярнасцю. У горадзе прыведзены ў парадак усе гасцініцы, якія прымаюць спартсменаў і турыстаў, а таксама санаторыі і аграсядзібы ў раёне.

На Гомельшчыне праводзіцца акцыя «Парад пераможцаў» да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прыведзены ў парадак больш за 500 помнікаў і воінскіх пахаванняў. Значна больш сёлета было суботнікаў. Вуліцы вёсак і гарадоў сталі яшчэ больш чыстымі і прывабнымі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## КРЭДЫТЫ НА БУДАЎНІЦТВА СТАЛІ ТАННЕЙШЫЯ

**З 15 мая буйнейшы банк нашай краіны знізіў працэнтныя стаўкі па раней заключаных крэдытных дагаворах на будаўніцтва (рэканструкцыю) і набыццё жылых памяшканняў з 38,5% да 37,5% гадавых. Аб гэтым рэдакцыі паведамілі ў прэс-службе Беларусбанка.**

Акрамя таго, спецыялісты банка паведамляюць, што з гэтай даты працэнтная стаўка па новых крэдытах на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылых памяшканняў на агульных падставах устаноўлена ў памеры 37,5% гадавых.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ТРЭНІРОЎКІ Ў СТЫЛІ «ВОРКАЎТ»

Упершыню ў Мінску прайшоў «Кубак Беларусі па стрыт воркаўт», які сабраў мацнейшых спартсменаў у беларускім руху Street Workout (ад англ. «Вулічная трэніроўка»).

Гэты рух — даступная альтэрнатыва заняткаў у дарагіх фітнес-клубах. Неад'емная частка гэтай культуры — свабода: магчымасць прыдумляць новыя практыкаванні і іх камбінацыі, ператвараючы трэніровачны працэс у гульню. У Беларусі стрыт воркаўт імкліва набірае папулярнасць, колькасць ахвотных удасканальваць сваё майстэрства на спартыўных пляцоўках расце з кожным днём.



Сёлетнія спаборніцтвы, якія праходзілі на спецыяльна арганізаванай пляцоўцы каля Палаца спорту, выявілі пераможцаў у пяці розных намінацыях.

У рамках мерапрыемства знакамітыя прадстаўнікі руху стрыт воркаўт правялі майстар-класы.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**


РУП «Институт недвижимости и оценки»

► ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА
(недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)

► ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего УП «Несвижское ЖКХ» на праве хозяйственного ведения**

| | | | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Торговое помещение с инв. № 621/D-21475 | Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Ленинская, 137-19 | 110 573 267 | 22 114 653 | 5 |

Назначение – торговое помещение. Этаж – подвал. Общая площадь изолированного нежилого помещения – 54 м². Год постройки – 1972. Стены – бетонные блоки. Перекрытия – ж/б. Полы бетонные. Проемы оконные – деревянные, двойные. Проемы дверные – деревянные. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная. Радио, телефон имеются.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона в размере, не превышающем 12 000 000 руб. на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Условия продажи Объекта – размещение объектов непроизводственного назначения.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 10 000 000 рублей.

**Аукцион состоится 19.06.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ.лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества УП «Несвижское ЖКХ», **проводимом 19 июня 2014 г.**
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 17.06.2014 в 12.00.**
**Заключительная регистрация участников 19.06.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Драченко Наталья Васильевна 8 (01770) 5-51-88, 8 (029) 648-21-04.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**



И З В Е Щ Е Н И Е   О   П Р О В Е Д Е Н И И   А У К Ц И О Н А

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 июня 2014 года проводит 12-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка, (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 187 | Автошасси Урал-375А ш. 300642 дв. 922960 1979 г. 4 кат. 1847 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 188 | Автошасси Урал-375Е ш. 214692 дв. 157294 1975 г. 4 кат. 9457 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 189 | Автошасси Урал-375 ш. 1672 дв. 173 1978 г. 4 кат. 1475 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 190 | Автошасси Урал-375 ш. 1028 дв. 639055 1982 г. 4 кат. 7140 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 191 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 172038 дв. 769852 1991 г. 3 кат. 100470 км | н.п. Лапичи, в/ч 44540 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 192 | Автошасси КамАЗ-43106 ш. 431000С0019870 дв. 911828 1986 г. пробег 61 869 км, кузов-фургон км-4310 1986 г. | в/г Околица Минский р-н, в/ч 3310 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 193 | Автошасси УРАЛ-4320 ш. 144335 дв. 583271 1990 г. 4 кат. 146278 км | г. Берёза, в/ч 23324 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 194 | Автошасси УРАЛ-4320-1012-01 ш. 112676 дв. 364961 1988 г. 4 кат. 69084 км | г. Берёза, в/ч 23324 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 195 | Автошасси УРАЛ-4320-1012 ш. 25738 дв. 560533 1986 г. 4 кат. 148844 км | г. Берёза, в/ч 23324 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 196 | Автошасси УРАЛ-4320-1012 ш. 164089 дв. 715104 1990 г. 4 кат. 53391 км | г. Берёза, в/ч 23324 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 197 | Автошасси УРАЛ-4320-1012 ш. 054935 дв. 898113 1986 г. 4 кат. 157521 км | г. Берёза, в/ч 23324 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 198 | Автошасси УРАЛ-4320-1012 ш. 048043 дв. 816417 1985 г. 4 кат. 52567 км | г. Берёза, в/ч 23324 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 199 | Мастерская ПМ-2-70М №Т35105 1986 г. 4 кат. в составе: -МРМ-М1 №031 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 671124 дв. 542718 -МРС-АР №72 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 671318 дв. 545290 -ТА-5М №Т35105 на КамАЗ-4310 1986г ш. 012538 дв. 789438 -АДБ-3120У1 №56711 на пр.1-П-1,5 1984 г. ш. 764 | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 130 000 000 | 13 000 000 |
| 200 | Мастерская ПМ-2-70М №Т35145 1986 г. 4кат 2118 км.в составе: -МРМ-М1 №255 на ЗИЛ-131 1985г ш. 662756 дв. 502818 -МРС-АР №071 на ЗИЛ-131 1985г ш. 655663 дв. 469670 -ТА-5М №Т35145 на КамАЗ-4310 1986г ш. 018115 дв. 885566 -АДБ-309У1 №Н351022 на пр.1-П-2,5 1986 г. ш. б/н | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 135 000 000 | 13 500 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **26 июня 2014 г. в 11.00.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 23 июня 2014 года**.
**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. Без НДС. **Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**
**Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**


**Администрация Первомайского района г. Минска**

**ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ОБЩЕСТВЕННОМ ОБСУЖДЕНИИ**

Градостроительный проект «Внесение изменений в градостроительный проект детального планирования района в границах: пр. Независимости – ул. Филимонова – Слепянская водная система – ул. Макаенка – детская железная дорога им. К. Заслонова – граница парка им. Челюскинцев»,

**которое будет проводиться в период с 30 мая по 23 июня 2014 года.**

Целью проекта является регулирование инвестиционных процессов на проектируемой территории в части установления градостроительных требований к ее использованию и застройке в соответствии с проектными предложениями генерального плана г. Минска (корректировка, 2010 г.).

Градостроительные регламенты:

*территории общественной специализированной застройки республиканского, городского и районного уровня* в зонах общественной застройки 288Осп и жилой смешанной застройки 62 Жсм;

*территории жилой смешанной многоквартирной высокоплотной застройки* в зонах общественной застройки 288Осп и жилой смешанной застройки 62 Жсм;

*территории коммунально-обслуживающего назначения* в зоне коммунально-обслуживающей застройки 71П4-ко.

На основании градостроительных условий, экономической оценки и существующей ситуации освоение проектируемой территории планируется реализовать в два этапа.

*На первом этапе предусматривается:* строительство 2 ДДУ (на 230 и 90 мест) в микрорайоне № 3, строительство школы на 792 места в микрорайоне № 1; строительство торгово-обслуживающего объекта по ул. Макаенка в микрорайоне № 1.

По производственному фонду: реконструкция и трансформация площадки «Национальной киностудии «Беларусьфильм» со сносом и выносом несоответствующих градостроительным регламентам производственных объектов, вынос «Автобазы Минкультуры», производственных объектов и картодрома УО «Республиканский центр технического творчества», снос станции 2-го подъема технического водоснабжения БГУ, снос автовокзала «Московский», строительство паркинга Республиканского центра олимпийской подготовки по гандболу вместо сносимого гаража; строительство паркинга на 350 м/мест.

По общественному фонду: начало строительства многофункционального комплекса на пересечении пр. Независимости – ул. Макаенка (ИООО «Зомекс Инвестмент»), строительство многофункционального комплекса на пересечении пр. Независимости – ул. Филимонова («Газпром»), строительство объекта на площадке Национальной телерадиокомпании, реконструкция медсанчасти с размещением жилого дома, завершение строительства многопрофильного спортивного зала по игровым видам спорта по ул. Филимонова, завершение реконструкции объекта ООО «ДиМ компания»; строительство торгово-обслуживающего объекта в микрорайоне № 2. Период до 2020 года.

*На втором этапе предусматривается:*

завершение строительства группы жилых многоквартирных домов на освобождаемой территории «Национальной киностудии «Беларусьфильм» – 8,6 тыс. м², строительство ДДУ на 150 мест и школы на 600 мест в микрорайоне № 2; строительство паркинга на 250 м/м на месте выноса складов, строительство торгово-обслуживающего объекта в микрорайоне №2, строительство объектов на площадке Национальной телерадиокомпании РБ.

В период с 2020 по 2030 годы.

Презентация проекта состоится 2 июня 2014 в 19.00 в средней общеобразовательной школе № 20, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Парниковая, 5а.

Иллюстративный материал по градостроительному проекту будет размещен на сайте администрации Первомайского района г. Минска в разделе «Общественные обсуждения» с 30 мая по 13 июня 2014 года.

Экспозиция градостроительного проекта, журнал для регистрации письменных замечаний и предложений будут находиться в здании средней общеобразовательной школы № 20, расположенном по адресу: ул. Парниковая, 5а, в холле на 1-м этаже с 30 мая по 13 июня 2014 года с 8.00 до 19.00.

**Замечания и предложения для дальнейшего рассмотрения и подведения итогов на архитектурно-градостроительном совете, формируемом Мингорисполкомом, необходимо направлять в период с 30 мая по 23 июня 2014 в администрацию Первомайского района г. Минска, управление архитектуры и строительства по адресу: г. Минск, пер. К. Чорного, 5, тел. 280 02 21, 280 45 41, 280 19 66.**

Адрес электронной почты: perv.arhit@minsk.gov.by

## ЛЕГЕНДЫ ХАКЕЯ — НА МІНСКІМ ЛЁДЗЕ!

Сёння напярэдадні матча паміж зборнымі Беларусі і Расіі адбудзецца старт аматарскага хакейнага турніру, ініцыяванага расійскім бокам, у які прымуць удзел вядомыя дружыны дзяржаў-суседак. Першымі на пляцоўку Лядовага палаца выйдуць каманды «Сталіца» і «Газпрамэкспарт». Эстафету падхопяць каманды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і легенд хакея СССР, якія правядуць матч на лядовай арэне «Юнацтва-Мінск». Увечары ўдзельнікі лядовых баталій адправяцца падтрымліваць свае зборныя на «Мінск-Арэну». А назаўтра пераможцы вышэйзгаданых паядынкаў сустрэнуцца ў фінале турніру, які адбудзецца на малой лядовай пляцоўцы «Чыжоўка-Арэна» ў 18.00.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

## ІСЦІ ШЛЯХАМ ПЕРАМОГ

Беларусы прайгравалі Германіі дзве шайбы, але здолелі пераламіць ход паядынку і дамагчыся ўпэўненай перамогі — 5:2

Гэты матч — з шэрагу самых адказных для беларусаў на мінскім чэмпіянаце свету па хакеі. Менавіта гульні з Германіяй, Латвіяй (якая завяршылася ўчора позна вечарам) павінны былі канкрэтна адказаць на пытанне аб нашых перспектывах наконт выхаду ў чвэрцьфінал.

Матч з немцамі хлопцы Глена Хэнлана распачалі жудасна — прапусцілі дзве шайбы за 12 хвілін перад запоўненымі трыбунамі «Мінск-Арэны». Аднак хлопцы сабралі ўсю беларускую моц у кулак і стрэлілі сапраўдным галявым залпам! На працягу наступных двух перыядаў шайбы закідвала толькі наша каманда. Шчаслівыя гледачы стоячы апладзіравалі Андрэю Сцяпанаву, Аляксею Угараву, Джэфу Плату і двойчы Міхаілу Грабоўскаму.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— У нас ёсць выканаўцы, якія могуць вырашаць зыход паядынку, і яны гэта даказалі, — прызнаўся **Глен ХЭНЛАН, галоўны трэнер зборнай Беларусі.** — Адставалі на дзве шайбы і праявілі характар. Браты Касціцыны, Грабоўскі, Калюжны выканалі сваю працу вельмі добра. Я задаволены перамогай. Але ў нас бізнес-падыход. Меседж наступны: «Мы перамаглі тройчы, але прыехалі не па гэта. У нас наперадзе матчы, у якіх трэба выкласціся яшчэ больш».

Зборная Германіі — адзіная каманда, якая на гэтым турніры дала зборнай Расіі сапраўдны бой. У нядзелю падапечныя Пэта Карціна два перыяды трымаліся з рускімі амаль на роўных і толькі ў трэцім адрэзку сустрэчы тройчы капітулявалі перад сапернікам. Астатнія матчы апошніх дзён прынеслі наступныя вынікі.

**Група А. 16.05.** Канада — Італія — 6:1, Швецыя — Славакія — 3:1. **17.05.** Францыя — Нарвегія — 5:4 (буліты), Данія — Чэхія — 4:3, Славакія — Італія — 4:1. **18.05.** Канада — Швецыя — 3:2 (авертайм), Чэхія — Нарвегія — 1:0.

**Становішча каманд:** Канада — 15 балаў, Швецыя — 15, Чэхія — 10, Францыя — 7, Нарвегія — 7, Славакія — 7, Данія — 5, Італія — 3.

**Група В. 16.05.** ЗША — Казахстан — 4:3 (авертайм), Фінляндыя — Швейцарыя — 3:2 (буліты), **17.05.** Латвія — Расія — 1:4, Беларусь — Германія — 5:2, Швейцарыя — Казахстан — 6:2, **18.05.** ЗША — Фінляндыя — 3:1, Расія — Германія — 3:0.

**Становішча каманд:** Расія — 18, ЗША — 11, Беларусь — 9, Латвія — 9, Фінляндыя — 8, Швейцарыя — 7, Германія — 5, Казахстан — 2.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## «У ВАС ЦУДОЎНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЎСІХ КАМАНД»

**Прасторныя раздзявальні і рэкорды наведвання. Прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазэль прызнаўся на прэс-канферэнцыі ў «Мінск-Арэне», што ён задаволены арганізацыяй чэмпіянату свету.**

— Мы вельмі задаволены тым, як праходзіць першынство свету па хакеі, — з усмешкай перад дзясяткамі журналістаў з розных краін прызнаўся Фазэль. — Мы нават не чакалі такой вялікай колькасці гледачоў і запаўняльнасці арэн. У гэты раз турнір стаў хатнім фактычна для чатырох зборных — Беларусі, Расіі, Латвіі і Славакіі. У вас фантастычныя стадыёны. Пасля гульні на «Чыжоўка-Арэне» мы зайшлі ў раздзявальню зборнай Швецыі. Яе памеры ўражваюць — 1500 квадратных метраў! Як кажуць прадстаўнікі шведскай каманды, у ёй можна нават згубіць хакеістаў. У Мінску насамрэч створаны цудоўныя ўмовы для ўсіх удзельнікаў. Адзінае, што нас засмучае, — вялікая колькасць траўмаваных хакеістаў. Сёлета я наведаў зімовыя Алімпійскія гульні ў Сочы. Гэта адна з найлепш Алімпіяд у маім жыцці. Таму, калі будзеце працягваць так і надалей, ваш чэмпіянат можа стаць лепшым у гісторыі.

Як заўважыў **Хорст ЛІХТНЕР, генеральны сакратар Міжнарой федэрацыі хакея,** рэкорд наведвання на хакейных чэмпіянатах свету быў устаноўлены ў 2004 годзе, у Чэхіі.

— На гэты момант (раніца панядзелка. — **Аўт.**) агульная колькасць наведвальнікаў чэмпіянату ў Беларусі складае 432 196 гледачоў. У сярэднім матч у Мінску наведвае 9495 чалавек, — падкрэслівае Ліхтнер. — У Чэхіі матчы першынства паглядзелі 552 097 балельшчыкаў. Мы ўпэўнены, што сёлета рэкорд будзе пабіты. У гэты раз 150 кампаній ажыццяўляюць з чэмпіянату жывыя трансляцыі. Упершыню ў гісторыі правядзення чэмпіянатаў свету агульная аўдыторыя гледачоў можа перавысіць мільярд чалавек.

— Дагэтуль наша краіна праводзіла шматлікія міжнародныя спаборніцтвы, а таму мы былі ўпэўнены, што ў нас павінна атрымацца, — адзначыў **Яўген ВОРСІН, дырэктар Дырэкцыі па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі-2014.** — З многім нам прыйшлося сутыкнуцца ўпершыню. Чэмпіянат рыхтавала ўся краіна. І калі ў нас нешта атрымалася, мы ўдзячны нашым настаўнікам — Міжнароднай федэрацыі хакея і кампаніі «Інфронт», яе камерцыйнаму партнёру, якія аказалі нам неацэнную падтрымку ў арганізацыі гэтага буйнога сусветнага хакейнага форуму. Нам казалі, што чэмпіянат атрымаецца толькі тады, калі ўсё будзе зроблена для хакеістаў, сродкаў масавай інфармацыі, балельшчыкаў. Але мы цудоўна разумеем, што ўступаем у вырашальную стадыю чэмпіянату — у фінальны раўнд. Нас таксама чакае правядзенне кангрэса Міжнароднай федэрацыі хакея. І мы павінны зрабіць яшчэ шмат дзеля таго, каб у тых, хто прыехаў у Мінск, захаваліся толькі самыя лепшыя ўражанні.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## Экзамен для лідараў

### ЦІ ЗДОЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЗБОРНАЯ ПЕРАЙГРАЦЬ РАСІЯН?

**Статыстыка — рэч упартая. У дачыненні да спорту, мабыць, у меншай ступені, бо тут заўжды ёсць месца для ўдачы, шанцавання, фарту… Тым не менш факты сведчаць аб тым, што беларуская хакейная зборная толькі аднойчы перамагала расійскую каманду на чэмпіянатах свету.**

Здарылася гэта ў далёкім 2000 годзе на планетарным першынстве ў Санкт-Пецярбургу. Але на расклад у групе гэты адметны вынік, на жаль, ніяк не паўплываў. Яшчэ на год раней зборныя Расіі і Беларусі правялі першую афіцыйную сустрэчу на чэмпіянаце свету ў нарвежскім Хамары. Гэты матч увайшоў у гісторыю супрацьстаянняў дзвюх каманд дзякуючы фінальнаму ліку — 2:2. Па цяперашнім рэгламенце чэмпіянатаў свету, нагадаем, нічыя недапушчальная, і пераможца матча выяўляецца ў авертайме ці серыі булітаў. З таго часу беларусы яшчэ пяць разоў сустракаліся з расіянамі на лядовых арэнах галоўнага хакейнага турніру свету, але перамагчы тытулаванага саперніка больш так і не атрымалася.

Перапісваць гісторыю заўжды складана. Але, здаецца, цяпер — самы час. Так, падапечныя Алега Знарка ў Мінску выглядаюць магутнай, непераможнай машынай. Толькі падумайце: у шасці гульнях — 29 закінутых шайбаў у вароты саперніка пры шасці прапушчаных! Але менавіта ў іх сіле можа хавацца… слабасць. Пасля перамогі над немцамі расійская зборная гарантавала сабе выхад у плэй-оф. Не дзіўна, калі ў апошнім матчы групавога раўнда Алег Знарок дасць крыху адпачыць сваім лідарам, апрабаваўшы новыя звёны і спалучэнні. Тым больш, што ператасоўкі непазбежныя: у апошнім паядынку расійская каманда страціла свайго капітана і аднаго з лепшых бамбардзіраў чэмпіянату Аляксандра Авечкіна. Пасля сутыкнення з форвардам нямецкай зборнай Маркусам Кінкам расійскаму хакеісту спатрэбілася медыцынская дапамога. Пазней стала вядома, што матч супраць беларусаў Авечкін прапусціць. І наадварот, упершыню на мінскі лёд выйдзе Яўген Малкін, які толькі ўчора прыляцеў у беларускую сталіцу. Ці зможа НХЛавец беспраблемна ўліцца ў сыграны калектыў і дапамагчы сваёй камандзе — пытанне адкрытае.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На жаль, ёсць страты і ў нашай дружыны. Да канца чэмпіянату выбыў траўміраваны форвард Канстанцін Кальцоў. Акрамя гэтага, апошнія матчы групавога этапу з-за дыскваліфікацыі прапусціць абаронца Мікалай Стасенка. Для лідараў беларускай каманды гэта дадатковая праверка на трываласць. А са сваёй задачай Міхаіл Грабоўскі, браты Касціцыны, Аляксей Калюжны на чэмпіянаце пакуль спраўляліся вельмі няблага. Спорт ведае нямала прыкладаў, калі перамог дабіваліся толькі на вялікім жаданні і матывацыі. Дададзім сюды родныя сцены і неверагодную падтрымку балельшчыкаў — чым не рэцэпт поспеху?

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

## Гавораць удзельнікі чэмпіянату і балельшчыкі:



**Цім СТЭПЛТАН,** *форвард зборнай ЗША, былы гулец ХК «Дынама-Мінск»:*

— Я даўно не быў у Мінску. А калі прыехаў, заўважыў, што з'явілася вельмі сучасныя, грандыёзныя будынкі, адкрываюцца новыя рэстараны. Арганізацыя чэмпіянату — на вышэйшым узроўні. Арэны, гасцініцы размешчаны побач — гэта вельмі зручна. Кожная дэталь прадумана прафесійна. Я сапраўды атрымліваю асалоду ад таго, што з'яўляюся часткай гэтага свята.



**Пэт КАРЦІНА,** *галоўны трэнер зборнай Германіі:*

— Мне здаецца, усе гульцы, госці, турысты адчуваюць, як беларусы любяць хакей і як нарацца сваёй гасціннасцю. Пакуль турнір прыносіць толькі станоўчыя эмоцыі, бо арганізацыя сапраўды выдатная. Таму я кажу сваім гульцам: трэба выказаць пашану гаспадарам чэмпіянату, паказваючы на лёдзе цікавы хакей. Пакажыце, на што вы здольныя! Бо арганізатары і балельшчыкі выкладваюцца тут па поўнай праграме.



**Уладзімір КРЫКУНОЎ,** *былы галоўны трэнер беларускай зборнай па хакеі, галоўны трэнер ніжнекамскага «Нафтахіміка»:*

— Атмасфера ў Мінску цудоўная! Я пабываў на «Мінск-Арэне» і «Чыжоўка-Арэне» — шыкоўныя збудаванні. Наведвальнасць высокая — не памятаю такой зацікаўленасці балельшчыкаў на папярэдніх чэмпіянатах. У фан-зонах таксама весела, людзі адпачываюць з задавальненнем. Думаю, Беларусі можна смела зноў заяўляцца на правядзенне сусветнага першынства. Наўрад ці Міжнародная хакейная федэрацыя стане пярэчыць. Няхай бліжэйшыя гады ўжо занятыя, але варта паспрабаваць «забіць» наступныя.



**Юхані ТАМІНЕН,** *балельшчык з Фінляндыі:*

— У апошні раз я быў у Мінску яшчэ ў канцы 1970-х і цяпер, прыехаўшы сюды зноў амаль праз 40 гадоў, проста захоплены тым, наколькі грунтоўна Беларусь падрыхтавалася да сусветнага хакейнага першынства. Я бываў на многіх спартыўных мерапрыемствах у розных краінах, але мне здаецца, што гэты чэмпіянат — самы лепшы. Па крайняй меры, з тых, на якіх мне даводзілася быць. Беларусь змагла арганізаваць усё на вышэйшым узроўні. Пра гэта сведчыць і атмасфера, якая цяпер пануе ў Мінску, і задавальненне, якое адчуваюць хакеісты і балельшчыкі.

■ Сёння — Сусветны дзень метралогіі

БелГИМ

# ВЫМЯРЭННІ І ГЛАБАЛЬНЫ ЭНЕРГЕТЫЧНЫ ВЫКЛІК

**Пад такім дэвізам праходзіць сёлета Сусветны дзень метралогіі. Якая сувязь паміж гэтымі паняццямі? Якім чынам на падобны выклік рэагуе айчынная метралогія? Адказы шукаем у Беларускім дзяржаўным інстытуце метралогіі.**

## 44 ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЭТАЛОНЫ

Паспяховае развіццё прамысловасці, працвітанне гандлю, захаванне якасці жыцця моцна залежаць ад бяспечнага і рацыянальнага выкарыстання даступнай энергіі. Попыт на энергію толькі расце, і надзвычай актуальным становіцца пошук новых крыніц энергіі, павышэнне яе эфектыўнага выкарыстання. Гэта немагчыма ўявіць без адпаведнай сістэмы вымярэнняў. Патрэба ў вымярэнні тэмпературы, электрычнасці і святла прымусіла выразіць крыніцы энергіі ў колькасным выражэнні — так з'явіліся адзінкі кельвіна, ампера і кандэлы. Першыя метады вымярэнняў тэмпературы, электрычнасці і святла былі распрацаваныя яшчэ ў XIX стагоддзі. Сучасныя метралагічныя даследаванні ў метралогіі скіраваныя на новыя віды энергіі. Нацыянальныя метралагічныя інстытуты свету імкнуцца, напрыклад, забяспечыць дакладнасць вымярэння эфектыўнасці тэхналогій з прымяненнем сонечных фотаэлектрычных элементаў, павысіць характарыстыкі металаў для энергетычных сістэм, заснаваных на энергіі ветру і хваляў і г.д. Вось такім чынам метралагічная супольнасць імкнецца адказваць на глабальны энергетычны выклік.

Для беларускай метралогіі 2014 год — юбілейны. У 1924 годзе была створана Беларуская палата мер і вагаў. Сёлета ж 15-годдзе з дня заснавання адзначыў і Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі, які падтрымлівае цесныя стасункі з шэрагам адпаведных міжнародных арганізацый, удзельнічае ў сумесных праектах. З канца 90-х у краіне пачаўся інтэнсіўны працэс стварэння нацыянальных эталонаў. Гэтыя эталоны дазваляюць ажыццявіць перадачу памераў адзінак даўжыні, масы, тэмпературы, часу, частаты і г.д. Айчынная эталонная база працягвае папаўняцца паводле Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Эталоны Беларусі». Зараз распрацоўваецца адпаведная праграма на 2016-2020 гады.

— Практычна ніводная дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма не рэалізуецца без метралагічнага забеспячэння, — кажа **дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі Мікалай ЖАГОРА.** — Пераход на прагрэсіўныя тэхналогіі ў прамысловасці прадугледжвае рост патрабаванняў да дакладнасці вымярэнняў, удасканальванне паверачнай базы і метадаў кантролю. Запатрабаванасць правядзення вымярэнняў з узроўнем дакладнасці, блізкім да эталоннага, пастаянна расце, сродкі вымярэнняў толькі ўскладняюцца, шырокае выкарыстанне атрымліваюць не толькі высокадакладныя вымяральныя прыборы, але і вымяральныя сістэмы і комплексы.

Нацыянальная эталонная база ўключае сёння ўжо 44 дзяржаўныя эталоны. Сёлета завяршаем работы па стварэнні шасці эталонаў: адзінак цеплаправоднасці, шчыльнасці патоку энергіі электрамагнітнага поля, аслаблення электрамагнітных ваганняў у дыяпазоне частот ад 0 да 37,5 ГГц, сярэдняй магутнасці; аслаблення і даўжыні хвалі аптычнага выпраменьвання для валаконна-аптычных сістэм сувязі і перадачы інфармацыі, адзінкі індуктыўнасці, магнітнай індукцыі пераменнага магнітнага поля.

У наступным годзе плануецца завершыць стварэнне эталона адзінкі светлавога патоку бесперапыннага выпраменьвання, эталоннага комплексу для кантролю лічбавых інтэрфейсаў (PDH/SDH) каналаў сувязі, эталоннай устаноўкі і стандартных узораў для аднаўлення, захавання і перадачы памеру адзінак удзельных магнітных страт і магнітнай індукцыі ў электратэхнічнай сталі і мадэрнізацыі зыходнага эталону адзінкі сілы.

Такая магутная эталонная база дазваляе ўдасканальваць работы ў галіне метралагічнага кантролю згодна з патрэбамі сённяшняга дня. Адзінства вымярэнняў прама і ўскосна скіравана на забеспячэнне аховы здароўя грамадзян, навакольнага асяроддзя, абарону правоў спажыўцоў, павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, дакладнасці ўліку сыравіны, энергіі і іншых рэсурсаў.

## ЯКАЯ Ў ТОРФУ ЭНЕРГІЯ ЗГАРАННЯ?



Мера цеплаправоднасці ў руках інжынера І катэгорыі Ганны ПЯТРОВАЙ.

У лабараторыі тэмпературных і цеплафізічных вымярэнняў забяспечваюць захоўванне, аднаўленне і перадачу адзінкі тэмпературы — кельвіна, адзінкі энергіі згарання — джоўля і адзінкі цеплаправоднасці. Працэс мадэрнізацыі нацыянальнага эталона адзінкі тэмпературы — кельвіна — працягваецца. Дыяпазон аднаўлення тэмпературы адбываецца згодна з міжнароднымі патрабаваннямі ў дыяпазоне ад -38 да 961 градуса па Цэльсію.

— Абсталяванне вельмі добрае, пацвердзіла заяўленую дакладнасць у галіне вымярэння тэмператур, — тлумачыць **намеснік начальніка вытворча-даследчага аддзела лабараторыі тэмпературных і цеплафізічных вымярэнняў Тамара ДЗІКУН.** — Наогул 30 працэнтаў усіх вымярэнняў у фізіцы прыпадае на вымярэнні менавіта тэмпературы. Яна прысутнічае ледзь ва ўсіх вытворчых працэсах — без яе немагчыма ні малако прастэрылізаваць, ні метал выплавіць. Так што важнасць гэтага эталона для эканомікі ў цэлым цяжка пераацаніць. Сучаснае жыццё імкліва развіваецца, і таму мы ў бліжэйшую пяцігодку плануем завяршыць работу па стварэнні новага тэмпературнага эталона — мінус 189 градусаў...

Для ажыццяўлення цеплафізічных вымярэнняў лабараторыя валодае Нацыянальным эталонам адзінкі энергіі згарання (джоўль) і Нацыянальным эталонам адзінкі цеплаправоднасці. Першы прымяняецца пры вырашэнні вымяральных задач для атрымання новых відаў паліва, падчас даследавання мясцовых відаў паліва — торфу, драўлянага паліва, біяпаліва, выкарыстанне якіх у сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі значна эканоміць спажыванне дарагога прыроднага газу і мазуту.

— На такім абсталяванні можна аднаўляць і захоўваць адзінкі цеплыні згарання і цвёрдых, і вадкіх рэчываў, — адзначае **начальнік вытворча-даследчага аддзела лабараторыі тэмпературных і цеплафізічных вымярэнняў Пётр КРЫВАНОС.** — Да такіх рэчываў можа, вядома, адносіцца і паліва. Вымярэнні на такім эталоне прамым чынам уплываюць на разлікі па спажыванні энергарэсурсаў. Работа па стварэнні гэтага эталона вялася з 2009 па 2013 год. Цяпер мы яго паспяхова прымяняем, паколькі ён адпавядае належным міжнародным патрабаванням. Сёння тут даследуюцца ўзоры вугалю, прадстаўленыя расійскім бокам — ідзе працэс параўнання.

Нацыянальны эталон адзінкі цеплаправоднасці запатрабаваны ў энергетыцы і будаўнічым комплексе, а таксама ў прыярытэтных кірунках развіцця навукі, тэхнікі і тэхналогій. Дыяпазон вымярэнняў — ад 0,02 Вт/(м·К) да 5 Вт/(м·К). Вось толькі з дапамогай установак А1 і А2 завяршыліся даследаванні сродкаў вымярэння, якія выкарыстоўваюцца для атэстацыі і каліброўкі адзінак цеплаправоднасці будаўнічых матэрыялаў. Энергазберагальны складнік — адзін з найважнейшых для сучасных будматэрыялаў.



Вядучы інжынер Алена СЯРКО рыхтуе каларыметр да правядзення доследу.

## КАБ ЭЛЕКТРАПРЫБОРЫ ПРАЦАВАЛІ БЕЗ ПЕРАШКОД

Наша жыццё ўсё больш насычаецца радыёвыпраменьваннем ад тэлебачання, радыёвяшчання, мабільнай сотавай сувязі і іншых радыёэлектронных прылад. У лабараторыі вымярэнняў электрамагнітных палёў спрабуюць выяўляць, як усё гэта сумяшчаецца — вызначаюць здольнасць таго ці іншага абсталявання функцыянаваць з нязменнай якасцю ў разнастайнай электрамагнітнай абстаноўцы і не ствараць недапушчальных электрамагнітных перашкод для іншых тэхнічных сродкаў.

Вымярэнне электрамагнітных палёў неабходнае штодня і ў самых розных сферах — для абароны інфармацыі ад несанкцыянаванага доступу, для кантролю выкарыстання радыёчастотнага спектра, атэстацыі працоўных месцаў са шкоднымі ўмовамі працы, кантролю ўзроўняў электрамагнітных выпраменьванняў у зоне жылой забудовы... Ва ўсіх такіх выпадках выкарыстоўваюцца вымяральныя антэны.



У новым памяшканні рыхтуюцца да вымярэння напружанасці электрамагнітнага поля.

Даследаваннем характарыстык і параметраў вымяральных антэн і вымяральнікаў напружанасці электрамагнітнага поля, іх паверкай і каліброўкай займаецца ў інстытуце лабараторыя вымярэнняў радыёчастотных электрамагнітных палёў.

— Для забеспячэння параметраў электрамагнітнай сумяшчальнасці любое абсталяванне, здольнае ствараць радыёперашкоды або быць схільным да такога ўздзеяння — хоць радыёрэлейная станцыя, хоць дзіцячая цацка на батарэйках — праходзіць комплекс выпрабаванняў, — кажа **начальнік сектара радыёэлектронных вымярэнняў Аляксей ВАЛЫНЕЦ.** — Мы знаходзімся ў экраніраванай бязрэхавай камеры. Гэта ўнікальнае тэхнічнае абсталяванне для правядзення даследаванняў і выпрабаванняў у галіне электрамагнітнай сумяшчальнасці было ўстаноўлена ў 2013 годзе. Металічны каркас камеры, шматлікія фільтры і валаконна-аптычныя развязкі не дапускаюць траплення ў камеру знешніх радыёперашкод, забяспечваючы тым самым поўную экраніроўку. Сценкі камеры абліцаваныя радыёпаглынальным матэрыялам, які не дапускае адлюстравання радыёхваляў у шырокім дыяпазоне частот.

Такім чынам у нашай лабараторыі вымяраюцца спектральныя параметры выпраменьванняў, узровень радыёперашкод рознага паходжання, праводзяцца выпрабаванні на ўстойлівасць да радыёчастотных электрамагнітных палёў, вызначаюцца характарыстыкі і параметры антэн.

Для вымярэння ўзроўню радыёперашкод, якія прыбор стварае ў працэсе работы, яго размяшчаюць на стале. Вымярэнні выконваюцца ў дыяпазоне частот ад 9 кГц да 18 ГГц. Абсталяванне дазваляе выяўляць устойлівасць да электрамагнітных палёў напружанасцю да 30 В/м.

— Калі гаварыць непасрэдна пра электрамагнітную сумяшчальнасць, то гэта не мае дачынення, скажам, да бяспекі выкарыстання таго ці іншага абсталявання, — удакладняе Аляксей Валынец. — Электрамагнітная сумяшчальнасць неабходна, кажучы простай мовай, для таго, каб у адным памяшканні маглі адначасова і без перашкод працаваць і дзіцячая радыёкіраваная цацка, і тэлевізар, і сотавая сувязь, і г.д. Колькі гадоў таму варта было ўключыць электрабрытву, як тэлевізар пераставаў працаваць належным чынам. Электронная ва́га таксама павінна паказваць патрэбную вагу́ незалежна ад блізкасці іншых радыёпрылад. Лабараторыя выконвае вялікую колькасць дзяржаўных кантрольных выпрабаванняў сродкаў вымярэння, выпушчаных як нашымі, так і замежнымі вытворцамі.



Сярод узораў, якія праходзяць выпрабаванні на электрамагнітную сумяшчальнасць, трапляюцца і сучасныя дзіцячыя цацкі. Адзін з такіх вырабаў прадэманстравала вядучы інжынер Вольга ЛОЙКА.

УНП 100055197 **Святлана БАРЫСЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

■ Трэба ведаць

# ЯК ПРАВІЛЬНА ПРАЦАЎЛАДКАВАЦЦА ЗА МЯЖОЙ

**Гандаль людзьмі займае трэцяе месца ў свеце па прыбытковасці пасля гандлю зброяй і наркотыкамі і з'яўляецца глабальнай праблемай чалавецтва. Беларусь не з'яўляецца выключэннем: нашы суайчыннікі ў пошуках вялікіх заробкаў усё яшчэ працягваюць трапляць у пасткі, расстаўленыя вярбоўшчыкамі жывога тавару.**

Тыя пад абяцаннем высокіх заробкаў прапануюць выехаць за мяжу для працаўладкавання — у асноўным, па будаўнічых і рабочых спецыяльнасцях. Вярбоўшчыкі наўмысна завышаюць будучыя даходы, утойваюць сапраўдныя ўмовы працы, не забяспечваюць ніякіх сацыяльных гарантый. Пры гэтым на будоўлях людзі нярэдка працуюць у нечалавечых умовах, часта не атрымліваюць заробленых грошай і не могуць вярнуцца дадому, а тое і знікаюць без вестак.

Каб абараніць сваё жыццё і здароўе, працаўладкоўвацца за мяжу трэба толькі пры садзейнічанні юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне дзейнасці, звязанай з працаўладкаваннем за межамі Беларусі.

**Тым, хто жадае працаўладкавацца за межамі Беларусі, неабходна ведаць наступнае:**

❍ Пры заключэнні працоўнага дагавора (кантракта) уважліва вывучыце і агаварыце ўмовы кантракта, якія тычацца характару і месца працы, тэрміну дзеяння кантракта, краіны працаўладкавання, умоў працы і яго аплаты, правоў і абавязкаў бакоў, умоў пражывання, харчавання, іншых сацыяльных гарантый.

❍ Вы абавязкова павінны мець рабочую візу дзяржавы працаўладкавання, выдадзеную яе дыпламатычным прадстаўніцтвам або консульскай установай (турыстычная віза не дае права працаваць).

❍ Неабходна мець з сабой копіі ўсіх дакументаў на выпадак страты арыгіналаў, страхавы поліс ад няшчасных выпадкаў і хвароб.

**У час знаходжання за мяжой:**

— станьце на часовы консульскі ўлік;

— ні ў якім разе нікому не аддавайце свой пашпарт;

— калі ўмовы вашага знаходжання адрозніваюцца ад тых, якія былі прапісаны ў дагаворы, звяжыцеся з агенцтвам. Запатрабуйце неадкладнага паляпшэння умоў. Калі сітуацыя не змяняецца, вы маеце права адмовіцца ад працы па дагаворы;

— у выпадку крадзяжу дакументаў або пры ўзнікненні якіх-небудзь праблем, звяртайцеся ў пасольства ці консульства Рэспублікі Беларусь або ў паліцыю той краіны, дзе вы знаходзіцеся.

**Святлана БУСЬКО.**

***А зарыентавацца ў тым, наколькі законна дзейнічае працадаўца за мяжой і яго прадстаўнікі ў Беларусі, вам дапаможа наступная інфармацыя, прадастаўленая рэдакцыі Міністэрствам унутраных спраў.***

## СПІС ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ, ЯКІЯ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ ДЗЕЙНАСЦЬ, ЗВЯЗАНУЮ З ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕМ ЗА МЕЖАМІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

| № рэестра | № ліцэнзіі і тэрмін дзеяння | Назва юрыдычнай асобы, прозвішча, імя, імя па бацьку ІП | Нумар тэлефона | Юрыдычны адрас | Дзяржава працаўладкавання | Спецыяльнасць |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 02010/0338253 да 24.06.2010 падоўжана да 24.06.2015 г. | Грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» (філіялы: абласныя камітэты грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» у гг. Брэсце, Віцебску, Гродне, Гомелі, Мінску, Магілёве, Мінскі гарадскі камітэт грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі») | 222 35 05 | Мінск, вул. К. Маркса, 40 | Расійская Федэрацыя | студэнцкія атрады |
| 2. | 02010/0200581 29.07.2005-29.07.2010 падоўжана да 29.07.2015 г. | Таварыства з дадатковай адказнасцю «Моладзевы цэнтр «Штаб студэнцкіх атрадаў» | 22 82 94<br>22 84 11 | г. Магілёў, вул. Ленінская, 68 | Чэхія,<br>Расійская Федэрацыя | рабочыя ў лясной гаспадарцы,<br>рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 3. | 02010/111 да 2.09.2010 г. падоўжана да 02.09.2015 г. | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства—камерцыйнае прадпрыемства «Арцель» | 36 62 69 | г. Віцебск, вул. Фрунзэ, 13а, пак. № 22 | Польшча | будаўнікі |
| 4. | 02010/0563146 да 2.09.2010 падоўжана да 2.09.2015 г. | Турысцкае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Інтурбюро» | 8 029 1086941 | г. Мінск, вул. Казінца, 123-15 | Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Польшча | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў, рабочыя па зборы клубніц і маліны |
| 5. | 02010/0563427 да 23.09.2015 г. | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Стар травел» | 290 46 06 | г. Мінск, вул. Старавіленская, д. 100, пак. 436 | Расійская Федэрацыя,<br>ЗША | спецыялісты ў галіне транспартнай лагістыкі і аўдытарскай дзейнасці, студэнцкія праграмы |
| 6. | 02010/0200660 да 21.10.2010 падоўжана да 21.10.2015 г. | Сумеснае прадпрыемства «Цэнтр маладзёжных падарожжаў» ТАА | 293 18 11<br>288 22 19 | г. Мінск, вул. Машэрава, д. 17, пакой 101 | ЗША | абслуговы персанал (праца для студэнтаў) |
| 7. | 02010/0200629 21.10.2005—21.10.2010 падоўжана да 21.10.2015 г. | Сэрвіснае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Джэтэкспа» | 328 67 57 | г. Мінск, вул. Старажоўская, д. 8—4п | ААЭ, Каралеўства Бахрэйн, Катар | абслуговы персанал |
| 8. | 02010/0200630 21.10.2005-21.10.2010 падоўжана да 21.10.2015 г. | Адкрытае акцыянернае таварыства «Нафтазаводмантаж» | 59 82 93 | Віцебская вобласць, г. Наваполацк | Расійская Федэрацыя | будаўнікі |
| 9. | 02010/0200648 2.12.2005-2.12.2010 падоўжана да 02.12.2015 г. | Турысцкае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Лінгва тур» | 281 73 73 | г. Мінск, пр. Незалежнасці, д. 58, корп. 9, пак. 301 | Расійская Федэрацыя<br>Федэратыўная Рэспубліка Германія | спецыялісты па вытворчасці і продажы тэкстыльных вырабаў<br>праграма Au-Pair (узрост да 25 гадоў) |
| 10. | 02010/0200957 да 23.12.2010 г. падоўжана да 23.12.2015 г. | Замежнае прыватнае ўнітарнае будаўніча-гандлёвае прадпрыемства «Нафтабуд Сэрвіс» Фіскіна А. | 71 16 04,<br>71 16 05 | г. Гомель, вул. Жаркоўскага, д. 26, к. б/н | Расійская Федэрацыя | вадзіцелі, мантажнікі, вадзіцелі міжнародных перавозак, электразваршчыкі |
| 11. | 02010/0338234 да 13.01.2011 падоўжана да 13.01.2016 г. | Рэспубліканская маладзёжная грамадская арганізацыя «Ліга добраахвотнай працы моладзі» | 284 08 81 | г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, д. 4 | Расійская Федэрацыя | персанал дзіцячага аздараўленчага лагера |
| 12. | 02010/90 дзеянне ліцэнзіі падоўжана да 7 красавіка 2021 г. | Замежнае прыватнае ўнітарнае кансалтынгавае прадпрыемства «Латвійскі Цэнтр Міжнароднага Абмену» грамадскай арганізацыі «Цэнтр Міжнароднага абмену» | 203 70 19,<br>226 79 24 | г. Мінск, вул. Максіма Танка, д. 30, корп. 1Н, офіс 40 | ЗША | студэнцкія праграмы |
| 13. | 02010/238 30.06.2006-30.06.2011 падоўжана да 30.06.2021 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «КТЛ» | 285 38 58 | г. Мінск, вул. Чапаева, 5, корп. 1, пам.11, офіс 322 | Расійская Федэрацыя | кіроўцы па міжнародных перавозках |
| 14. | 02010/385 падоўжана да 12.01.2022 | Індывідуальны прадпрымальнік Чарняўскі Андрэй Якаўлевіч | 5 53 66 | г. Дзяржынск, вул. Тургенева, 16-38 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 15. | 02010/399 дзеянне падоўжана да 16.02.2022 | Адкрытае акцыянернае таварыства «Электрацэнтр-мантаж» | 212 50 29 | г. Мінск, прамзона «Заходняя», вул, Мантажнікаў, 37 | Расійская Федэрацыя | мантажнікі і наладчыкі абсталявання ГЭС |
| 16. | 02010/426 падоўжана да 16.03.2022 г. | Прыватнае сэрвіснае ўнітарнае прадпрыемства «Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва занятасці моладзі і студэнтаў» | 77 08 60 | г. Гродна, вул. Ваўковіча, д. 4, корп. 1, офіс 70 | Расійская Федэрацыя<br>Чэшская Рэспубліка<br>Літоўская Рэспубліка | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў, абслуговы персанал,<br>рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў, работнікі харчовай галіны<br>рабочыя аўтасэрвісу |
| 17. | 02010/488 да 01.06.2022 | Вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства Пелуця Зыгмунта Казіміравіча «Паланійны цэнтр бізнесу і турызму», г. Гродна | 73 17 43,<br>74 56 49 | г. Гродна, вул. Будзёнага, 48а | Расійская Федэрацыя<br>Рэспубліка Польшча | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў<br>рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў, швачкі, аператары электрычных вязальных машын |
| 18. | 02010/518 да 29.06.2022 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Студыя моды Сяргея Нагорнага» | 209 95 90 | г. Мінск, пр. Незалежнасці, д.11, корп. 2, паверх 2, пак. 221 | Украіна | дэманстратары адзення, фотамадэлі |
| 19. | 02010/533 да 03.08.2022 г. | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Транслейборыдж» | 029 6666477 | г. Мінск, вул. Голубева, д. 21, пам. 14 | Каралеўства Нідэрланды | праграмісты |
| 20. | 02010/531 да 03.08.2022 | Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ІММО-ТРАСТ» | 226 00 24 | г. Мінск, вул. Казарменны, д. 4, офіс 14 | Германія | праграмісты |
| 21. | 02010/0338142 сапраўдная да 11.11.2010 падоўжана да 11.11.2015 | Закрытае акцыянернае таварыства «Беларуская калійная кампанія» | 211 04 43 | г. Мінск, вул. Мельнікайтэ, 2-1805а | Бразілія | спецыяліст па продажах |
| 22. | 02010/0338205 11.01.2008-11.01.2013 падоўжана да 11.01.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВЕРА» | 222 93 80,<br>222 93 81 | г. Мінск, вул. Валадзько, д. 24, пак. 1а | Расійская Федэрацыя | будаўнікі, мантажнікі |
| 23. | 02010/682 да 04.04.2023 г. | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «МажорПерсанал» | 335 24 00 | г. Мінск, вул. Мележа, д. 1, пак. 1116 | Латвійская Рэспубліка | кухары |
| 24. | 02010/735 да 20.06.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ОСМОС» | 267 24 15 | г. Мінск, пр. Незалежнасці, 95, пак. 13 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 25. | 02010/868 31.10.2008-31.10.2013 падоўжана да 31.10.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ІСМІРА» | 250 70 80 | г. Мінск, вул. Ціміразева, д. 65А, каб. 305А | ЗША<br>Расійская Федэрацыя<br>Латвійская Рэспубліка | праца на круізных лайнерах<br>кіроўцы-міжнароднікі<br>кіроўцы |
| 26. | 02010/930 да 09.01.2024 г. | Закрытае акцыянернае таварыства «ГРАДОС» | 269 94 53 | г. Мінск, вул. Адоеўскага, д.117, 5-ы паверх, каб. № 8 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 27. | 02010/0338791 31.07.2009-31.07.2014 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Мэнпаўэр Бел» | 334 80 07 | г. Мінск, вул. Камуністычная, д. 11, офіс 302/1 | Расійская Федэрацыя | праграмісты, офісныя работнікі |
| 28. | 02010/318 падоўжана да 29.09.2021 г. | Адкрытае акцыянернае таварыства «Мінскпрамбуд» | 283 15 73 | г. Мінск, пр. Партызанскі, д. 144, каб. № 27 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 29. | 02010/0563007 30.12.2009-30.12.2014 | Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт» | 267 07 84 | г. Мінск, пр. Незалежнасці, д. 99, корп. 1, пак. 220 | Федэратыўная Рэспубліка Германія | Студэнты дзённых аддзяленняў сельскагаспадарчых ВНУ, работа падчас летніх канікул у фермерскіх гаспадарках |
| 30. | 02010/1323 да 12.02.2015 | Прыватнае сэрвіснае ўнітарнае прадпрыемства «Трэвел груп» | 288 61 59 | г. Мінск, вул. В. Харужай, 1А, офіс 645 | Круізныя лайнеры прыпісаныя да партоў ЗША, Канады, Еўропы, Аўстраліі | Фатографы, кухары, прадаўцы, афіцыянты, адміністратары, пакаёўкі |
| 31. | 02010/1642 31.03.2011-31.03.2021 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Мэтро Модэл Менеджмент» | 029 9538534 | г. Мінск, вул. Валгаградская, д. 6, каб. 31 | Італьянская Рэспубліка | мадэлі |
| 32. | 02010/1643 15.04.2011-15.04.2021 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «МБ Лайн» | 218 12 06 | г. Мінск, пр. Незалежнасці, 169, офіс 503 С | Расійская Федэрацыя | кіроўцы, вадзіцелі-міжнароднікі |
| 33. | 02010/1644 13.05.2011-13.05.2021 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Студыя Тамара» | 226 98 45 | г. Мінск, пр. Пераможцаў, 1, к. 29а | Расійская Федэрацыя | мадэлі |
| 34. | 02010/1645 29.07.2011-29.07.2021 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «МАВАНИ» | 334 39 96 | г. Мінск, вул. Гая, д. 4, корп. 1, памяшканне 13Н | Расійская Федэрацыя | рабочыя |
| 35. | 02010/1647 16.09.2011-16.09.2021 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Будкадры» | 23 02 11 | г. Магілёў, вул. Першамайская, д. 29 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 36. | 02010/1649 14.10.2011-14.10.2021 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Полистафф сервисес» | 256 21 09 | г. Мінск, вул. Панамарэнкі, д. 35А, пам. 227 | Расійская Федэрацыя | работнікі гандлёвай залы, работнікі складу |
| 37. | 02010/1650 31.10.2011-31.10.2021 | Прыватнае турысцка-экскурсійнае ўнітарнае прадпрыемства «Беларустурыст» | 226 94 85 | г. Мінск, вул. М. Танка, 30, памяшканне 1Н | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 38. | 02010/1651 31.10.2011-31.10.2021 | Таварыства з дадатковай адказнасцю «КИАТ» | 202 45 24 | г. Мінск, пр. Пераможцаў, д. 18, корп. 2, каб. 5 | Расійская Федэрацыя | інжынеры |
| 39. | 02010/1652 29.11.2011-29.11.2021 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Першая юрыдычная кансультацыя» | 71 43 23 | г. Гомель, вул. Ірынінская, д. 21Б, офіс 6 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 40. | 02010/1655 29.11.2011-29.11.2021 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Ау энд ін» | 306 03 26 | г. Мінск, вул. Максіма Танка, д. 20, пак. № 222 | Каралеўства Бельгія | абслуговы персанал у дамах састарэлых |
| 41. | 02010/1656 09.12.2011-09.12.2021 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Белтрудцентр» | 8 029 1504949 | г. Мінск, вул. Чкалава, 12, пак. № 310 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 42. | 02010/1657 23.12.2011-23.12.2021 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «СтафКансалтынг» | 3285617 | г. Мінск, пр. Пушкіна, 39, оф. 7 | Расійская Федэрацыя | вадзіцелі, офісныя работнікі, рабочыя, абслуговы персанал |
| 43. | 02010/1658 23.12.2011-23.12.2021 | Прыватнае гандлёва-кансалтынгавае ўнітарнае прадпрыемства «СтройСевер-Консалтинг» | 8 029 3820328 | г. Магілёў, зав. Камісарыяцкі, д. 29, пам. 9 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 44. | 02010/1659 31.01.2012-31.01.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ОСК-про» | 247 91 03 | г. Мінск, вул. Якубава, д. 10, 4-ы паверх, к. 1 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 45. | 02010/1660 31.01.2012-31.01.2022 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «ФэшнМодэлс» | 327 33 65,<br>029 166 8 111 | г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, д.5, офіс 317 | Рэспубліка Карэя | мадэлі |
| 46. | 02010/1661 31.01.2012-31.01.2022 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Світвэй» | +375163412990 | Брэсцкая вобл., г. Баранавічы, вул. Камсамольская, 9 | Расійская Федэрацыя | сельскагаспадарчыя работнікі |
| 47. | 02010/1662 10.02.2012-10.02.2022 | Вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Прафесійная Лінія» | 8 029 6236823,<br>222 19 33 | г. Мінск, вул. Чкалава, 12-3, каб. 304, 311 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 48. | 02010/1664 24.02.2012-24.02.2022 | Замежнае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Персоннель Інтэрнэшнл» | 390 05 52<br>(029) 650 35 35 | г. Мінск, вул. Чарнышэўскага, д. 10А, офіс 91 | Рэспубліка Польшча | абслуговы персанал |
| 49. | 02010/1665 24.02.2012-24.02.2022 | Прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Рэн-Сэрвіс» | vel 8 029<br>307 66 36 | г. Мінск, вул. Аэрадромная, д. 5/2, кв. 25 | Расійская Федэрацыя | работнікі будаўнічай галіны, кіроўцы |
| 50. | 02010/1666 13.03.2012-13.03.2022 | Замежнае прыватнае сэрвіснае ўнітарнае прадпрыемства «Чысты свет плюс» | 265 62 31 | г. Мінск, вул. Шафарнянская, 11 | Расійская Федэрацыя | работнікі па тэхнічным абслугоўванні будынкаў |
| 51. | 02010/1668 30.03.2012-30.03.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Захадхіммантаж» | 204 01 37 | г. Мінск, вул. Гусоўскага, 2а, офіс 5-5 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 52. | 02010/1669 30.03.2012-30.03.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Інтэл-Страйд» | 269 92 31 | г. Мінск, пр. Партызанскі, д. 14, офіс 411 | Расійская Федэрацыя | кіроўцы |
| 53. | 02010/1670 13.04.2012-13.04.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «АльфаУниСтрой» | 298 41 27 | г. Мінск, пр. Партызанскі, д. 2, пак. 7 | Расійская Федэрацыя | работнікі будаўнічай галіны |
| 54. | 02010/1671 13.04.2012-13.04.2022 | Унітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Фортисплюс» | 327 54 05 | г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, д. 9А, пам. 26 | Літоўская Рэспубліка | кіроўцы па міжнародных перавозках |
| 55. | 02010/1672 13.04.2012-13.04.2022 | Замежнае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Кадравы саветнік» | 396 79 49 | г. Мінск, вул. Семяняка, 22 (ПТС), памяшканне 5 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 56. | 02010/1673 15.05.2012-15.05.2022 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «РусАутАктив» | 237 50 60 | г. Мінск, пл. Свабоды, 4 | Расійская Федэрацыя | рабочыя на вытворчасць |
| 57. | 02010/1674 15.05.2012-15.05.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Камфорт Экспа» | 286 34 99 | г. Мінск, вул. Мар'еўская, д. 7А, пам. 1, пак. № 16 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 58. | 02010/1675 11.06.2012-11.06.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Мела Роса» | 22 52 78 | г. Магілёў, зав. Камісарыяцкі, д. 5а, офіс 34а | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 59. | 02010/1677 13.07.2012-13.07.2022 | Прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Вдлерт» | 029 22 22 715,<br>029 935 18 25 | г. Віцебск, вул. Гогаля, д. 14, офіс 710 Б | Расійская Федэрацыя | работнікі станцы тэхабслугоўвання аўтамабіляў |
| 60. | 02010/1678 17.08.2012-17.08.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Прамысловы арсенал» | 256 29 68 | г. Мінск, вул. Панамарэнкі, д. 7, каб. 110 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 61. | 02010/1679 17.08.2012-17.08.2022 | Індывідуальны прадпрымальнік Каваленка Вольга Іванаўна | 029 699 64 62 | г. Барысаў, вул. Трусава, д. 55, кв. 193 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 62. | 02010/1680 14.09.2012-14.09.2022 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Бюро працоўных рэсурсаў» | 290 65 16 | г. Мінск, вул. Азгура, 1, пам. 2Н, к. 5 | Расійская Федэрацыя | работнікі сферы абслугоўвання |
| 63. | 02010/1681 14.09.2012-14.09.2022 | Прыватнае камерцыйнае ўнітарнае прадпрыемства «Диманш» | 70 33 00 | г. Гомель, вул. Працоўная, д. 7а | Расійская Федэрацыя | рабочыя на вытворчасць |
| 64. | 02010/1682 28.09.2012-28.09.2022 | Таварыства з дадатковай адказнасцю «ПоўначПрамБуд» | 57 34 63 | г. Гомель, пл. Прывакзальная, д. 1, пам. 717 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 65. | 02010/1683 26.10.2012-26.10.2022 | Прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Актавиус» | 029 1492370 | г. Мінск, вул. Валадзько, д. 30, офіс 205 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 66. | 02010/1684 14.12.2012-14.12.2022 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Старлайт Цэнтр» | 70-59-08, 17 | г. Магілёў, зав. Пажарны, д. 19, офіс 19 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 67. | 02010/1685 15.03.2013-15.03.2023 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «ТАК» | 327-49-49<br>327-27-62 | г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 12а, пакой 4 | Расійская Федэрацыя | абслуговы персанал |
| 68. | 02010/1687 24.05.2013-24.05.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «БелБізнес Груп Надзея» | 22-03-81 | г. Магілёў, вул. Першамайская, д. 29, пакой 413 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 69. | 02010/1688 21.06.2013-21.06.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Амега-Універсал» | + 375 44 5422883 | г. Мінск, вул. Серафімовіча, 11, офіс 116 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 70. | 02010/1689 26.07.2013-26.07.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кадравае агенцтва «Ударнік» | 390-07-88 | г. Мінск, вул. Пінская, д. 28, офіс 19 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 71. | 02010/1690 09.08.2013-09.08.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «РосаБелЭкспорт» | 029 785-7-858 | г. Гродна, вул. Паповіча, д. 5, офіс 735 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 72. | 02010/1691 09.08.2013-09.08.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТакитПлюс» | 8-029-1608620 | г. Мінск, вул. Казлова, 19, пам. 1Н, пакой 29 | Расійская Федэрацыя | кіроўцы таксі |
| 73. | 02010/1692 30.08.2013-30.08.2023 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Пракладчык» | 8025 798 05 04 | г. Мінск, вул. Прытыцкага, 62А, корп. 1, 3 паверх | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 74. | 02010/1693 13.09.2013-13.09.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Актыў Рэсурс» | 8044500 65 66 | г. Мінск, вул. Маскоўская, д. 6. Пакой. № 5 а | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 75. | 02010/1694 27.09.2013-27.09.2023 | Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «ПрофРекрутингЦентр» | 8 0163 583905 | г. Баранавічы, вул. Т. Шаўчэнкі, 3 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 76. | 02010/1695 27.09.2013-27.09.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ОпалихГрупп» | 80336993865 | г. Брэст, вул. Куйбышава, 13, офіс 8 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 77. | 02010/1696 27.09.2013-27.09.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Цэнтр кадравых рашэнняў» | +375297116091 | г. Віцебск, вул. М.Горкага, д. 62, к. 708 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 78. | 02010/1697 25.10.2013-25.10.2023 | Індывідуальны прадпрымальнік Хачатран Сцяпан Вараздатавіч | 202-44-39 | г. Мінск, вул. Ціміразева, 82, кв. 39 | Украіна | спартсмены |
| 79. | 02010/1698 25.10.2013-25.10.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Дайманд Персанал» | 284-98-76<br>+ 375 29 1263 583 | г. Мінск, вул. Мар'еўская, д. 7а, пам. 3, пакой 15 | Расійская Федэрацыя | кіроўцы па міжнародных перавозках |
| 80. | 02010/1699 29.11.2013-29.11.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВестДжиГрупп» | 290-29-36 | г. Мінск, вул. В. Харужай, 4-12, літар Р 4-8/К-КП (адміністрацыйна-вытворчы корпус 15), паверх 4, пам. 18 | Расійская Федэрацыя | работнікі ювелірнай вытворчасці |
| 81. | 02010/1700 27.12.2013-27.12.2023 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «БелПрофПерсонал» | + 375 29<br>924 68 61 | г. Мінск, вул. Я.Коласа, д.39А, пакой 10 | Расійская Федэрацыя | рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў |
| 82. | 02010/1701 28.02.2014-28.02.2024 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Залатыя кадры» | + 375 29<br>5050 507 | г. Мінск, вул. Алеся Гаруна, д. 25, памяшканне 1Н, адміністрацыйны пакой № 7/14 | Расійская Федэрацыя | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 83. | 02010/1702 28.02.2014-28.02.2024 | Унітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Піпл Проджектс і Оперейшнс» | 8 029 6316863 | Мінская вобл., Мінскі р-н, в Каплічы, зав. Зялёны, д. 1, каб. 55 | Рэспубліка Казахстан | працаўнікі розных спецыяльнасцяў |
| 84. | 02010/1703 28.02.2014-28.02.2024 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кадравы рэсурс» | 8 029 6299255 | г. Мінск, пр. Пушкіна, д. 39, офіс 7 (2 паверх) | Расійская Федэрацыя | працаўнікі ў супермаркет |
| 85. | 02010/1704 28.03.2014-28.03.2024 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Ивельтир» | +375 29<br>7037797 | г. Віцебск, пр. Фрунзэ, д. № 81, корп. № 33А, пам. № 618в | Літоўская Рэспубліка | кіроўцы-міжнароднікі |
| 86. | 02010/1705 28.03.2014-28.03.2024 | Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сіатон плюс» | 8-029-6207036 | г. Наваполацк, вул. Камсамольская, д. 5, кв. 101 | Латвійская Рэспубліка | кіроўцы-міжнароднікі |
| 87. | 02010/1706 28.03.2014-28.03.2024 | Унітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Іберанс» | + 375 29<br>6150 177 | г. Віцебск, вул. Беларуская, в 6а, каб. 200 | Расійская Федэрацыя | кіроўцы-міжнароднікі |

■ На сувязі з чытачом

# З ЛЮБОЎЮ ДА «РОДНАЙ ПРЫРОДЫ»

## Фотаапарат стане памочнікам для вывучэння прыродазнаўства ў школе

**Нядаўна мы разыгралі прыз сярод падпісчыкаў часопіса «Родная прырода» на II квартал. Лёс каштоўнага прыза — лічбавага фотаапарата — вырашыла малпа Жанна, якая выцягнула паперку з прозвішчам пераможцы. Ёй стала настаўніца хіміі і біялогіі ДУА «Коранскі вучэбна-педагагічны комплекс сад-сярэдняя агульнаадукацыйная школа» Лагойскага раёна Мінскай вобласці Наталля Эдуардаўна МАЛЕЙ, якая жыве ў вёсцы Зарэчча. Наталля Эдуардаўна прыехала па прыз у рэдакцыю, падзялілася ўражаннямі пра абноўлены часопіс і распавяла пра выхаванне ў сваіх вучняў павагі і любові да роднай зямлі і прыроды.**



«Выпісваю часопіс яшчэ з 90-х гадоў, — распавядае Наталля Эдуардаўна. — У снежні мінулага года зноў аформіла падпіску: чакаю часопіс, а яго ўсё няма! Аказваецца, ён «спазніўся», таму што памяняў свайго выдаўца, трапіў пад крыло Выдавецкага дома «Звязда». Абноўлены часопіс — вельмі яркі, насычаны цікавымі артыкуламі і прывабнымі фотаздымкамі нашай прыроды — Наталлі Эдуардаўне прыйшоўся даспадобы, асабліва старонкі, прысвечаныя свойскім жывёлам. Выданне стала сямейнай чытанкай — ім цікавіцца таксама муж нашай гераіні. Аднак дома часопіс не залежваецца — усе выпускі Наталля Эдуардаўна прыносіць у школу, і дзеці з задавальненнем чытаюць матэрыялы.

Доўгі час Наталля Эдуардаўна выкладала толькі хімію, і калі давялося ўзяць у нагрузку біялогію, па першым часе ёй было складана, таму вялікую колькасць каштоўнай інфармацыі яна брала менавіта са старонак часопіса. І цяпер, паводле слоў настаўніцы, урокі праходзяць на «выдатна», калі рыхтаваць іх з дапамогай «Роднай прыроды».

Аднак у школе прывыклі паказваць любоў да жывога не словамі, а справай. На тэрыторыі вучэбна-педагагічнага комплексу створана школьнае лясніцтва, у якім заняты і вучні. Напрыклад, зараз перад маладымі эколагамі стаіць задача — змайстраваць хатку для сям'і лебедзяў-шыпуноў, якія пасяліліся на школьным возеры. У самой школе ёсць дэндрарыі з разнастайнымі кветкамі — дзеці самі дагледаюць зялёных сяброў, вывучаюць іх паходжанне. «Збіраем розныя зёлкі, гарбату з іх можна пакаштаваць у нашым фітабары», — кажа Наталля Эдуардаўна і паказвае фотаздымкі.

Настаўнікі ў суаўтарстве з вучнямі распрацавалі адмысловую экалагічную вандроўку. На тэматычных прыпынках можна агледзець бабровыя хаткі, іх жыхароў, мясцовую рэчку, змяшаны лес, адметныя валуны. «Экалагічная сцежка — месца, дзе ў дзяцей ёсць магчымасць успрымаць прыроду ў комплексе, — адзначае Наталля Эдуардаўна. — Дзеці самі малююць карту мясцовасці, вучацца арыентаванню».

Фотаапарат, які атрымала наша пераможца, стане добрым памочнікам для настаўніцы і яе выхаванцаў: цяпер усю прыгажосць прыроды можна будзе захаваць на фотаздымках. Зычым Наталлі Эдуардаўне і яе вучням плёну ў вывучэнні навакольнага асяроддзя.

**Кацярына РАДЗЮК.**

*Дарэчы, неўзабаве выйдзе майскі нумар часопіса «Родная прырода». А ў ім — шмат цікавага. Напрыклад, чаму зубр... рохкае, дзе ў Беларусі знаходзіцца сапраўднае Кулікова поле, як набрацца станоўчай энергетыкі ад бярозы і яшчэ шмат цікавай інфармацыі пра флору і фаўну нашай краіны.*

*А тым часам ужо ідзе падпіска на часопіс на III квартал і II паўгоддзе. Не прапусціце самае цікавае, жывіце ў гармоніі з прыродай разам з намі!*

■

■ Пытальнік

# ЦІ ПАТРЭБНА РЭГІСТРАВАЦЬ ГАНАК І НАВЕС?

***Валодаю дачай у Пухавіцкім раёне: участкам у 10 сотак і садовым домікам. Дачны домік знаходзіцца ў сярэдзіне ўчастка, ад мяжы суседзяў не менш за 6 метраў. Драўляны ганак прыйшоў у непрыгоднасць. Хачу зрабіць яго з бетону і агарадзіць цаглянымі сценамі, каб у дом не дзьмуў вецер. Начальнік аддзела архітэктуры Пухавіцкага райвыканкама сказала, што я змагу гэта зрабіць, затым толькі ў БТІ трэба будзе аформіць. Умова — вытрымаць адлегласць ад мяжы суседзяў у 3 метры. Яшчэ ў мяне быў драўляны навес, які стаяў асобна. БТІ ўключыла яго ў тэхпашпарт. З-за аварыйнага стану я навес разабраў. Ці трэба гэта ўзаконіць?***

**Віктар Анатольевіч СІНКАВЕЦ,**
*г. Мінск.*

Зварот чытача быў разгледжаны ў Пухавіцкім раённым выканаўчым камітэце, адкуль рэдакцыя атрымала афіцыйны адказ.

«Зямельны ўчастак, які належыць В.А. Сінкаўцу на праве ўласнасці, знаходзіцца ў садаводчым таварыстве «Горкі-1».

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 г. №50 «Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садаводчых таварыстваў», забудова на тэрыторыі садаводчых таварыстваў адбываецца на падставе генеральнага плана забудовы садаводчага таварыства па ўзгадненні з праўленнем садаводчага таварыства.

Што датычыцца драўлянага ганка, змяненне плошчаў, у тым ліку абкладанне цэглай і знос пабудоў, з'яўляюцца рэканструкцыяй (рэканструкцыя — гэта будаўніча-мантажныя работы па змяненні параметраў аб'екта капітальнага будаўніцтва), якая праводзіцца ў адпаведнасці з ТПК 45-3.01-117-2008 (02250) «Градабудаўніцтва. Раёны сядзібнага будаўніцтва. Нормы планіроўкі і забудовы», па ўзгадненні з праўленнем садаводчага таварыства.

Пасля завяршэння будаўніча-мантажных работ грамадзянін рэгіструе змяненні ў РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» на падставе даведкі, выдадзенай старшынёй садаводчага таварыства.

У вышэйзгаданым выпадку, згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 г. №50 «Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садаводчых таварыстваў», мясцовыя выканаўчыя, распарадчыя органы аказваюць прававую дапамогу ў адпаведнасці з кампетэнцыяй».

■

# ЭЛЕАНОРА: імя, якое стала брэндам

18 мая ў будынку Белтэлерадыёкампаніі прайшло развітанне з вядомай тэлевядучай Элеанорай ЯЗЕРСКАЙ

**У яе не было званняў, аднак у яе было Імя — а гэтая рэч куды больш каштоўная, чым любая ўзнагарода.**
**Пра людзей вядомых звычайна гавораць: «Гэтае прозвішча стала іменем». З Элеанорай атрымалася наадварот: яе імя стала арыгінальным творчым аўтарскім брэндам. Калі гаварыць пра Элеанору, прозвішча можна і не ўдакладняць: усе і так разумеюць, пра каго размова.**



Калегі, сябры, музыканты, спевакі, артысты, проста прыхільнікі творчасці тэлежурналісткі ўзгадвалі яе адметны аўтарскі «Музычны салон» на Беларускім тэлебачанні, яе бліскучыя радыёэфіры, аўтарскі блог, які вяла на працягу некалькіх гадоў на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня», цыкл праграм «Жанчыны XX стагоддзя» на СТБ, удзел у тэлепраекце АНТ «Дзве зоркі», намінацыю ў Тор-50 самых стыльных і паспяховых асоб Мінска, ролі ў кіно...

За што б яна ні бралася, усё атрымлівалася «па-язерску» ярка і таленавіта.

Дзе б яна ні з'яўлялася, як магніт, прыцягвала да сябе позіркі. Яе аглядалі з ног да галавы, уважліва і скрупулёзна. Ацэньвалі...

Звычайна яна не расчароўвала чаканні цікаўных. Вопратка, манеры паводзін і нешта яшчэ зусім невыказнае стваралі вакол гэтай жанчыны аўру таямнічасці, загадкавасці, багемнасці, бамонду. Складвалася ўражанне, што, ведаючы гэта, яна нібыта наўмысна падыгрывала сама сабе: усяляк устанаўлівала, зацвярджала ўласны (створаны ў тым ліку і іншымі) імідж.

Элеанора нібыта іграла... саму сябе, выконваючы ролю Элеаноры Язерскай, — увасабляла тое, да чаго імкнулася сама і чаго чакала ад яе асяроддзе.

Да яе ставіліся па-рознаму: з зайздрасцю і захапленнем, з паблажлівасцю і злосцю, іранічна і зацікаўлена. Не было побач толькі абыякавасці. Зноў жа, з прычыны таго, што гэта была не проста прывабная жанчына, а таленавітая, неардынарная асоба, надзеленая бліскучым пачуццём гумару, далікатнасцю, інтэлектам. І... вострым языком — не без гэтага!

Прыкладам для Элеаноры заўсёды была мадам Како Шанэль. Яна любіла паўтараць услед за француженкай: «Прырода дорыць вам твар у 20 гадоў, жыццё мадэлюе яго ў 30, а ў 50 вы павінны заслужыць яго самі».

У 50 гадоў Элеанора правяла свой бенефіс. Сабраўся амаль увесь сталічны бамонд. Гэта быў вельмі прыгожы вечар, прасякнуты вытанчанай атмасферай салоннасці, водарам «мільёна пунсовых руж», незвычайнасцю шыкоўных туалетаў гаспадыні. Быў сапраўдны «зорны» парад артыстаў беларускай эстрады, класічнай і народнай музыкі, оперы, аперэты, цырка.

Тагачасныя намеснікі міністра культуры У. Рылатка і Ю. Цвяткоў адзначылі, што міністэрскія паклоннікі Элеаноры назвалі яе «каралевай музычнай журналістыкі». Кампазітар Ігар Лучанок расказаў, што быў выкладчыкам Язерскай у кансерваторыі: «Яна ў мяне фугі пісала!» Кампазітар Эдуард Ханок успамінаў Элеанору ў Мінскім музычным вучылішчы — праўда, адразу ж удакладніў, што сам вучыўся на старэйшым курсе.

На тым «бенефісным салоне» гучалі і жартаўлівыя эпіграмы, накшталт:

*Яна заўсёды ў тэле,*
*Яна заўсёды ў целе!*
*Ад чар Элеаноры*
*Вам не схавацца ў норы...*

Яе імя заўсёды было ахутана шчыльнай сеткай чутак-плётак. Без гэтага, магчыма, яна і не стала б жанчынай, якую ведаюць усе?

Аднойчы, памятаю, спытала Элеанору пра самую прыемную, але няпраўдзівую плётку. Смеючыся, яна адказала: «Белае норкавае манто мне падарыў Буба Кікабідзэ».

А яшчэ яна вельмі любіла жывёл. Заўсёды ў яе жыў кот.

Элеанора была цікавым і шчырым суразмоўцам. Вось некалькі фрагментаў гутарак з ёй.

***— Якім чынам вам удаецца заставацца Жанчынай у наш складаны час?***

— «Быть женщиной — великий шаг, сводить с ума — геройство».

***— Пішучы гэтыя словы, Барыс Пастарнак меў рацыю?***

— Безумоўна!.. Даволі часта, калі прачынаюся раніцай, і нічога не хочацца, і галава баліць — я падыходжу да люстэрка. І няхай адлюстраванне, якое бачу перад сабой, не вельмі радуе, усё ж гавару: нягледзячы ні на што і насуперак усяму, лепшай за мяне, прыгажэйшай за мяне жанчыны няма! Гэтая ўпэўненасць вельмі дапамагае. Раю так рабіць усім.

***— Ці заўсёды выглядаеце так, як хочацца?***

— Не, вядома. І з кожным годам усё больш складана «выглядаць». Але сапраўдная жанчына — яна па-за ўзростам і па-за часам. Жартам гавару сама сабе, што я — вечная... А на пытанні, колькі мне гадоў, звычайна адказваю: каго цікавіць мой узрост, той не цікавіць мяне...

Помніце, у Мікалая Забалоцкага: «...Так что такое красота? И почему её обожествляют люди? Сосуд она, в котором пустота, или огонь, мерцающий в сосуде?» Прыгожы твар — не толькі тое, што дала прырода, а з гадамі — не толькі касметычныя крэмы, маскі, макіяж. Гэта яшчэ і духоўнасць, унутранае святло. Жанчына павінна быць добразычлівай і абавязкова — закаханай. Незакаханая жанчына — страчаная жанчына. Каханне надае нам жыццёвую энергію, моц, упэўненасць у сабе.

***— Вы жанчына зменлівая?***

— «Увлекающаяся» — так сказала б. Я ніколі нічога не губляю, акрамя... галавы!

***— У адной з праграм вы гаварылі, што жанчына не павінна ганяцца за мужчынам: маўляў, мышалоўка ж не бегае за мышшу...***

— Дамам нельга забываць, што мужчыны — паляўнічыя. Яны заўсёды павінны даганяць, інакш ім нецікава. А мы часам можам дазволіць ім дагнаць сябе.

***— Вы эмансіпаваная жанчына?***

— Безумоўна. Усё жыццё я шукала тую мужчынскую спіну, за якой магла б хоць крыху адпачыць. Аднак такой надзейнай спіны ў маім жыцці... амаль ніколі не было. Усе праблемы заўсёды вырашаю сама... Так, я самастойная і незалежная — але не ўпэўнена, што такой і павінна быць жанчына.

***— Раскажыце, калі ласка, пра вашу дыету.***

— Толькі паглядзеўшы на мяне, можна зразумець, што я не люблю дыеты: ем усё, што падабаецца.

***— Вас лічаць ці не галоўнай модніцай...***

— Адзенне — частка майго экраннага вобразу, таму праблема «што апрануць?» перада мной паўстае асабліва востра. Калі працуеш у кадры, непрыемна быць у тыповай сукенцы, купленай на стадыёне «Дынама»: такую носіць палова жанчын. Я часта бываю на стадыёне, але для мяне гэта своеасаблівы праменад: назіраю, як апранаюцца жанчыны і... як не трэба апранацца. Часцей за ўсё адзенне я прыдумваю сама. Камусьці падабаецца, хтосьці лічыць мой стыль занадта экстравагантным — але гэта я, мая сутнасць!..

❍❍❍

У час развітання з Элеанорай Аркадзьеўнай Язерскай кіраўнікі вядучых беларускіх тэлеканалаў, вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, калегі і сябры ўзгадалі творчыя тэлевяршыні самабытнай і непаўторнай тэлевядучай-музыказнаўцы; выказалі шчырыя спачуванні родным, блізкім і ўсім прыхільнікам яе творчасці.

Таленавітых людзей пры жыцці заўжды «трохі замнога». Але як не хапае іх, калі яны пакідаюць нас. Назаўсёды...

Пахавалі Элеанору Аркадзьеўну Язерскую на Усходніх (Маскоўскіх) могілках беларускай сталіцы.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

# АПТЫМІЗАЦЫЯ ДЛЯ АПТЫМІСТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзякуючы дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця вёскі за апошнія гады мы набылі мабільныя ўстановы культуры. І цяпер практычна кожны раён валодае бібліёбусам і аўтаклубам, якія абслугоўваюць жыхароў тых населеных пунктаў, дзе закрываюцца клубы, бібліятэкі. І я мяркую, за імі будучыня. Мы добра ўсведамляем, што дзяржава не ў стане вынесці нагрузку па ўтрыманні шматлікіх устаноў культуры: гэта не толькі заработная плата, але і камунальныя паслугі, іншыя затраты. Таму мы рухаемся ў кірунку аптымізацыі выкарыстання сродкаў, матэрыяльных рэсурсаў.

***— Усякае рэфармаванне, як правіла, цягне за сабой скасаванне рабочых месцаў. Вы таксама сутыкнуліся з гэтым?***

— Што датычыцца штатаў, то ў першую чаргу скарачаюцца работнікі, якія не маюць спецыяльнай адукацыі і не зрабілі нічога, каб яе атрымаць. Хаця магчымасці для гэтага ёсць. Мы адкрылі ў Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў завочнае аддзяленне для таго, каб практыкі маглі вучыцца. З тымі, хто не захацеў гэтага зрабіць ці з нейкіх прычын не змог, давядзецца развітацца. Разам з тым, пенсіянеры, якія шмат гадоў аддалі сістэме культуры, вопытныя і актыўныя, будуць тут працаваць, нягледзячы на ўзрост. Сярод іх шмат такіх, без каго мы проста не ўяўляем культурнае жыццё вобласці. Таму ні пра якія скарачэнні гэтых людзей размова не вядзецца.

***— Разам з тым, Міністэрства культуры раіць скараціць штаты на 20%. Ці магчыма гэта ў цэнтральным рэгіёне?***

— Я невыпадкова прааналізавала даныя за апошнія 15 гадоў — для таго, каб выпрацаваць крытэрый і зразумець, да якіх межаў можам аптымізавацца. Я разлічыла штатную колькасць работнікаў культуры на 1 тыс. насельніцтва і параўнала з іншымі рэгіёнамі. Атрымалася, што ў Мінскай вобласці яна — адна з самых нізкіх: 6,2 адзінкі на 1000 чалавек. У Брэсце — 7,7, Віцебску — 8,2, Гомелі — 9,5, Гродне — 6, Магілёве — 9,9.

Акрамя таго, 1153 установы з 1420 (звыш 80% ) на Міншчыне знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. У цэнтральным рэгіёне буйных устаноў культуры не так многа. І якраз на іх прыпадае асноўная нагрузка, бо менавіта тут працуе большасць з 554 калектываў, якія маюць званні «народны», «узорны». Гэта нашы лепшыя творчыя сілы, на якія абапіраемся.




Разам з тым, ёсць населеныя пункты, дзе, так бы мовіць, установы культуры дубліруюцца. У выпадку, калі клуб знаходзіцца за два кіламетры ад такога ж у бліжэйшай вёсцы, то аналізуем, дзе лепш яго захаваць. Гэта дае магчымасць умацаваць матэрыяльную базу, прадаставіць насельніцтву больш якасныя паслугі.

***— І які эканамічны эфект атрымалі ў выніку новаўвядзенняў?***

— Магчыма, не такі значны, які хацелася б бачыць, але ён ёсць. Перш за ўсё — за кошт эканоміі сродкаў па аплаце камунальных паслуг, паслуг сувязі, продажу на аўкцыёне выслабаненых будынкаў. Тыя, што бліжэй да Мінска, раённых цэнтраў, дзе актыўна развіваецца бізнес, практычна ўсе запатрабаваны. А вось што датычыцца глыбінкі — ёсць пэўныя праблемы з рэалізацыяй. У спадчыну ад савецкага часу нам дасталіся велізарныя клубныя пабудовы, што ўзводзілі калгасы. Мець такі палац тады было прэстыжна, ды і з абслугоўваннем не было праблем. Але сёння, калі колькасць сельскіх жыхароў катастрафічна памяншаецца, вёска старэе, вымірае — яны не запатрабаваны. Сітуацыя складаная, неадназначная, але стараемся ўцягнуць усе будынкі ў гаспадарчы абарот. Мясцовыя органы ўлады прымаюць рашэнне: выставіць іх на аўкцыён, перапрафіляваць, перадаць на баланс іншай арганізацыі. А старыя дамы проста зносяцца.

Разам з тым, заўважу, што эфектыўнасць аптымізацыі нельга вымяраць толькі эканамічнай выгадай. Галоўны эфект — у дзейнасці ўстановы культуры. А яна не павінна быць месцам для разавых мерапрыемстваў. Толькі там, дзе праводзіцца работа, створаны жывыя творчыя аб'яднанні, калектывы, ёсць гарантыя захаваць клубную і бібліятэчную ўстановы.

***— Аптымізацыя мае на мэце не толькі ўмацаваць матэрыяльную базу ўстаноў культуры, але і вырашыць кадравыя пытанні?***

**У многіх сельскіх установах культуры ў штаце 2 — 3, максімум 4 супрацоўнікі. Скараціўшы хаця б аднаго з іх, мы пагаршаем даступнасць культурных паслуг для насельніцтва.**

— Штогод да нас на работу прыбывае каля 200—250 выпускнікоў, але, між іншым, адчуваем цяжкасці з кадрамі ў аддаленых раёнах, у асноўным па спецыяльнасцях «Харэаграфічнае мастацтва» і «Рэжысура масавых свят і абрадаў». Для выпраўлення сітуацыі пашыраем прыём на гэтыя дэфіцытныя спецыяльнасці ў навучальных установах. Спадзяюся, у бліжэйшай перспектыве праблему забяспечанасці кадрамі вырашым.

***— Мінская вобласць — лідар па правядзенні разнастайных фестываляў прафесійнай і аматарскай творчасці...***

— Так, на Міншчыне штогод праходзіць больш як 20 культуралагічных мерапрыемстваў. У тым ліку такія маштабныя, як Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. Што датычыцца прафесійнага мастацтва, то ў нас некалькі праектаў з Нацыянальным канцэртным аркестрам Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга: «Заслаўе», «Музы Нясвіжа», «Любанскія сустрэчы», музычны праект «Міншчына сустракае джаз» у пасёлку Чысць Маладзечанскага раёна. Шмат мерапрыемстваў праводзіцца ў мэтах развіцця аматарскай творчасці літаральна па ўсіх кірунках. Гэта фестывалі тэатральнага мастацтва «Бярэзінская рампа» і «Чароўны куфэрак», эстраднай песні «Вясеннія рытмы», харэаграфічнага мастацтва «Карагод сяброў», харавога мастацтва «Пеўчае поле» і іншыя. Дарэчы, «Пеўчае поле» — адзін са старэйшых фестываляў, які праводзіцца на Міншчыне з 1952 года. І мы ганарымся тым, што ў Мінскай вобласці захаваліся масавыя калектывы, падтрымліваем іх кіраўнікоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Напярэдадні

# РЫХТУЮЦЦА ДА ЮБІЛЕЮ РЭПІНА

**На Віцебшчыне рыхтуюцца адсвяткаваць 170-ю гадавіну з дня нараджэння знакамітага мастака Рэпіна. Ілья Яфімавіч нарадзіўся 24 ліпеня (5 жніўня па новым стылі. — Аўт.) 1844 года.**

Яго жыццё непарыўна звязана з Прыдзвінскім краем. У 1892 годзе ён на маляўнічым беразе Заходняй Дзвіны ў ваколіцах Віцебска набыў сядзібу. Зрабіў гэта на грошы, атрыманыя за сваю карціну «Запарожцы пішуць ліст турэцкаму султану». У сядзібе пад Віцебскам ён напісаў не менш знакамітыя палотны — «Беларус», «Месяцавая ноч» і іншыя.

Музей-сядзіба Рэпіна «Здраўнёва» з'яўляецца філіялам Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. На яе тэрыторыі захаваліся і ліпы, пасаджаныя Майстрам...

Таксама плануюць аднавіць знакамітую на ўвесь свет віцебскую мастацкую школу. Традыцыі «заснавальнікаў новага мастацтва» канца 1910-х — пачатку 1920-х гадоў працягнуць сучасныя творцы. Самыя лепшыя ўмовы для іх плённай працы задумалі стварыць на базе віцебскага камбіната «Мастацтва».

Паводле слоў Аляксандра Косінца, старшыні Віцебскага аблвыканкама, у горадзе будзе адкрыты музей, прысвечаны творчасці не толькі К. Малевіча, М. Шагала, але і настаўніка Марка Захаравіча — Юдэлю Пэну. Карціны апошняга цяпер знаходзяцца ў мастацкім музеі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белсвязьстрой» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**здания производственного корпуса,**

**общ. пл. 4385.0 кв.м (инв. № 500/С-32244)** на зем. участке пл. 0,6888 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования) по адресу: г. Минск, ул. Стебенева, 10 А.
На земельном участке имеются ограничения (обременения) прав в использовании: охранная зона ливневой канализации (0,1880 га), охранная зона водопровода (0,1827 га).
Часть недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 27 320 844 000 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (2 732 084 400 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.01.2014.*

Аукцион состоится **19.06.2014** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.06.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

И З В Е Щ Е Н И Е

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ объекта «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 11 (по генплану) со встроенными помещениями и подземной автостоянкой в г. Минске, *опубликованную в газете «Звязда» 27 февраля 2014 года:***

УНП 100071325

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений №№ 5, 15, 41, 42, 43, 44, 45, 46, 48, 50, 51, 52, 53, 55, 56, 57, 58, 61, 62, 63, 64, 67, 68, 69, 70, 73, 74, 75, 76, 79, 80, 81, 82, 85, 86, 87, 88 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: 1-комнатные квартиры – 1620 долларов США, 2-комнатные квартиры – 1570 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату зачисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США, и составит, соответственно, 1570 долларов США и 1520 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

БПС-СБЕРБАНК

**В связи со снижением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с 22,5% до 21,5% годовых, ОАО «БПС-Сбербанк» с 19.05.2014 устанавливает по вновь привлекаемым и автоматически продлеваемым срочным банковским депозитам физических лиц в белорусских рублях следующий размер процентов:**

СР НБ РБ с 19.05.2014 – 21,5% годовых

| Наименование депозита / сумма депозита | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| **«Сохраняй»** | | | | | |
| от 500 тыс. – до 5 млн. | 16(СР-5,5 п.п.) | 18,25(СР-3,25 п.п.) | 20,25(СР-1,25 п.п.) | 22,25(СР+0,75 п.п.) | 24,25(СР+2,75 п.п.) |
| от 5 млн. – до 25 млн. | 17,5(СР-4 п.п.) | 19,25(СР-2,25 п.п.) | 21,5(СР) | 23,5(СР+2 п.п.) | 25,5(СР+4 п.п.) |
| от 25 млн. – до 100 млн. | 18,25(СР-3,25 п.п.) | 20(СР-1,5 п.п.) | 22(СР+0,5 п.п.) | 24,25(СР+2,75 п.п.) | 26,25(СР+4,75 п.п.) |
| от 100 млн. | 18,5(СР-3 п.п.) | 20,25(СР-1,25 п.п.) | 22,5(СР+1 п.п.) | 24,5(СР+3 п.п.) | 26,5(СР+5 п.п.) |
| **«Пополняй»** | | | | | |
| от 500 тыс. – до 5 млн. | 15,75(СР-5,75 п.п.) | 18(СР-3,5 п.п.) | 20(СР-1,5 п.п.) | 22(СР+0,5 п.п.) | 24(СР+2,5 п.п.) |
| от 5 млн. – до 25 млн. | 17,25(СР-4,25 п.п.) | 19(СР-2,5 п.п.) | 21,25(СР-0,25 п.п.) | 23,25(СР+1,75 п.п.) | 25,25(СР+3,75 п.п.) |
| от 25 млн. – до 50 млн. | 18(СР-3,5 п.п.) | 19,75(СР-1,75 п.п.) | 21,75(СР+0,25 п.п.) | 24(СР+2,5 п.п.) | 26(СР+4,5 п.п.) |
| от 50 млн. – до 100 млн. | 18,25(СР-3,25 п.п.) | 20(СР-1,5 п.п.) | 22(СР+0,5 п.п.) | 24,25(СР+2,75 п.п.) | 26,25(СР+4,75 п.п.) |
| от 100 млн. | 18,4(СР-3,1 п.п.) | 20,2(СР-1,3 п.п.) | 22,4(СР+0,9 п.п.) | 24,4(СР+2,9 п.п.) | 26,4(СР+4,9 п.п.) |
| **Наименование депозита / неснижаемый остаток** | | | | | |
| **«Управляй»** | | | | | |
| 1,5 млн. | 10,5(СР-11 п.п.) | 12,5(СР-9 п.п.) | 14,5(СР-7 п.п.) | 16,5(СР-5 п.п.) | 18,5(СР-3 п.п.) |
| 5 млн. | 11,5(СР-10 п.п.) | 13,5(СР-8 п.п.) | 15,5(СР-6 п.п.) | 17,5(СР-4 п.п.) | 19,5(СР-2 п.п.) |
| 25 млн. | 14,5(СР-7 п.п.) | 17,5(СР-4 п.п.) | 19,5(СР-2 п.п.) | 21,5(СР) | 23,5(СР+2 п.п.) |
| 100 млн. | 15,5(СР-6 п.п.) | 18,5(СР-3 п.п.) | 20,5(СР-1 п.п.) | 22,5(СР+1 п.п.) | 24,5(СР+3 п.п.) |
| Депозит и текущий (расчетный) счет с использованием банковской платежной карточки «Пенсионный» – 21,5 (СР) | | | | | |

По депозитам, привлеченным до 19.05.2014, установленный размер процентов будет применен с 20.06.2014.
**Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по единому короткому номеру 148**

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2013 г. (млрд. руб.): январь – 18,4; февраль – 22,4; март – 29,1; апрель – 32,8; май – 26,8; июнь – 20,8; июль – 22,2; август – 26,9; сентябрь – 29,8; октябрь – 34,8; ноябрь – 33,0; декабрь – 33,5.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 05.06.2013 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»*

■ Дзеля памяці

# ПАЛЕСКІЯ АФІНЫ

## У Слоніме адкрылі шыльду ў гонар Міхала Казіміра Агінскага

**На новым будынку Слонімскага драматычнага тэатра ўрачыста адкрылі мемарыяльную шыльду, прысвечаную Міхалу Казіміру Агінскаму (1728 — 1800) — гетману Вялікага Княства Літоўскага, мецэнату, кампазітару, заснавальніку традыцый тэатральнага мастацтва ў Слоніме. Аўтар мемарыяльнай шыльды — слонімскі скульптар Леанід Богдан.**



Падчас яе адкрыцця прысутнічалі сам скульптар, дырэктар тэатра Мікалай Лішык і старшыня Слонімскага райвыканкама Алег Таргонскі. Таксама завіталі члены Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам міністра адукацыі Беларусі Сяргея Маскевіча.

З дзейнасцю вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага быў звязаны росквіт Слоніма ў другой палове XVIII стагоддзя. У ноч на 23 верасня 1771 года яго трохтысячнае войска было разбіта пад Сталавічамі (цяпер Баранавіцкі раён) войскамі Суворава, таму Агінскаму давялося эміграваць. Але праз чатыры гады, атрымаўшы амністыю і секвестраваныя маёнткі, ён вярнуўся ў гэты горад. Па яго ініцыятыве і на яго сродкі быў створаны канал, які носіць яго імя. Ён пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, заснаваў тэатр і капэлу.

У тэатры Міхала Казіміра Агінскага працавалі прафесійныя беларускія, польскія, нямецкія, італьянскія оперныя і драматычныя акцёры, мастакі, прыгонны хор і балет. Тэатр меў свае філіялы ў Целяханах і ў Сельдцах. Збор нот твораў, што выконваліся на сцэне тэатра, уключаў 60 опер, 18 балетаў, 3 музычныя камедыі, 253 сімфоніі і больш за 460 іншых музычных твораў. У 1781 годзе функцыянаваў «плывучы тэатр» на баржах на Агінскім канале. А «дом оперы» меў вялікую сцэну, прыстасаваную для паказаў барочных спектакляў, оперных і балетных, для выхаду вялікай колькасці спевакоў і артыстаў, для тэатральных баталій коннікаў і водных феерый (частка сцэны затаплялася вадой з канала і па ёй плавалі лодкі), для складаных дэкарацый, розных сцэнічных эфектаў. Тэхнічныя магчымасці сцэны дазвалялі паказваць і два фантаны, якія асвятляліся бенгальскімі агнямі.

Побач з тэатрам у 1765 годзе ў Слоніме пачала дзейнічаць першая кавярня («кафенхаус»). Гэта быў сапраўды шыкоўны цагляны будынак, аздоблены ўсярэдзіне шаўковымі шпалерамі і гравюрамі на медзі. Посуд тут быў фаянсавы варшаўскай вытворчасці.

Сам Міхал Казімір Агінскі пісаў музыку і літаратурныя творы, некаторыя з іх былі надрукаваны ў слонімскай друкарні. Ён выдаў кнігу «Байкі і не байкі» ў двух тамах.

Тэатр Агінскага знаходзіўся на Опернай вуліцы. Але, на вялікі жаль, гэты будынак не захаваўся. Але ёсць Оперная вуліца — назвы такой не мае ніводзін горад у свеце. І той, хто наведае Слонім, можа прайсціся па ёй, уяўляючы, як некалі спяшаліся тут артысты ў свой родны тэатр, славуты ў Еўропе.

Затое захавалася аўстэрыя, пабудаваная з цэглы архітэктарам Боем, які праектаваў пры палацы Агінскага шэраг барочных надворных пабудоў. Палова першага паверха аўстэрыі была адведзена пад гасцёўню, перакрытую чатырма паруснымі скляпеннямі з цэнтральнай апорай. Пад гэтай часткай дома знаходзяцца шырокія скляпеністыя падвалы. Цэнтральная лесвіца вузкага вестыбюля вядзе на другі жылы паверх. Аўстэрыя — адзіная ўцалелая пабудова гэтага найцікавейшага палацавага ансамбля другой паловы XVIII стагоддзя. Яна дае ўяўленне пра агульны характар барочнай архітэктуры.

Слонім часоў Агінскага нярэдка называлі палескімі Афінамі. Сюды ў святочныя дні з'язджаліся вяльможы і багацейшая шляхта з усяго краю і нават з Варшавы. Горад меў узорны парадак. Скверы, сады, аранжарэі і рыбныя ставы ствараліся і дагляладаліся лепшымі спецыялістамі Еўропы. Дарэчы, у Слоніме пры двары Міхала Казіміра Агінскага прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады яго пляменніка Міхала Клеафаса Агінскага, аўтара вядомага ўсім паланэза «Развітанне з Радзімай». Тут ён атрымаў пачатковую музычную адукацыю ў вядомага музыканта і кампазітара Іосіфа Казлоўскага.

**З дзейнасцю вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага быў звязаны росквіт Слоніма ў другой палове XVIII стагоддзя.**

Той тэатральны шлях, які пачаў у Слоніме Міхал Казімір Агінскі амаль 250 гадоў назад, працягваецца і сёння. У горадзе 24 гады існуе прафесійны дзяржаўны драматычны тэатр, які ставіць спектаклі па п'есах беларускіх, рускіх, польскіх, французскіх, украінскіх і італьянскіх драматургаў. А сёлета на месцы старога Народнага дома адкрыўся новы будынак для тэатра. На ім цяпер красуецца і мемарыяльная шыльда, прысвечаная Міхалу Казіміру Агінскаму.

**Сяргей ЧЫГРЫН.**
**Фота аўтара**

■ Калекцыя

# Што агульнага ў Блоні і Луўра,

## ці Як выжыць раённаму музею?



**У вёску Блонь Пухавіцкага раёна, у якой знаходзіцца краязнаўчы музей, нашчадкі роду Бонч-Асмалоўскіх перадалі старажытную мэблю. Усе прадметы — XIX стагоддзя: абедзенны і пісьмовы сталы, шафа, люстэрка і туалетны столік пад яго, два крэслы, круглы столік, кніжная паліца і куфар. Атрымалася стварыць цэлы музейны пакой, які адпавядае той эпосе...**



Аляксандр ПРАНОВІЧ.

### З ПІЦЕРСКАЙ КАМУНАЛКІ — У ЭКСПАЗІЦЫЮ

Вядомага ў XIX стагоддзі двараніна Анатоля Бонч-Асмалоўскага калісьці выслалі з Пецярбурга за ўдзел у рэвалюцыйных хваляваннях. Сваім новым месцам жыхарства ён зрабіў Пухавіччыну, пасяліўшыся ў вёсцы Блонь. Аднак і тут ён не адмовіўся ад актыўнай грамадзянскай дзейнасці, яго маёнтак мясцовыя жыхары называлі не іначай, як «гняздом рэвалюцыйнай заразы»... Ужо ў Беларусі ў вядомага рэвалюцыянера нарадзіліся дзеці Іван, Ірына, Радзівон, Глеб. Менавіта апошні, Глеб Анатольевіч Бонч-Асмалоўскі, стаў пасля славутым навукоўцам, гісторыкам, антраполагам.

У маёнтку бацькі ў Блоні Глеб скончыў школу, затым вучыўся ў Мінскім камерцыйным вучылішчы і Мінскай гімназіі. Пасля гэтага малады чалавек паступіў у Пецярбургскі ўніверсітэт — з таго часу паўночная сталіца Расіі стала яго другім домам, там ён правёў большую частку жыцця. Пасля бацькі ў гэтай кватэры працягваў жыць яго сын Андрэй, затым унучка Марыя. Менавіта яна, руская пісьменніца, вырашыла ахвяраваць сваю маёмасць дзеля стварэння музейнага пакоя на радзіме знакамітага дзеда.

**Дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея Аляксандр ПРАНОВІЧ** расказаў, што летась сам ездзіў забіраць гэтую мэблю з Санкт-Пецярбурга. Усе прадметы, па яго словах, знаходзіліся ў піцерскай кватэры тыповай дарэвалюцыйнай пабудовы: пакой плошчай 48 квадратных метраў, з высокай столлю. «Пасля рэвалюцыі багатых высялялі і іх жыллё аддавалі простым людзям, — тлумачыць Аляксандр Пpановіч. — Калі я быў у Санкт-Пецярбургу, вельмі здзівіўся, што там шмат людзей дагэтуль жыве ў такіх старадаўніх дамах, з агульным калідорам. Аднак цяпер іх найчасцей здаюць прыезджым, якім трэба часова зняць жыллё». Атрымліваецца, што да таго, як знайсці сваё месца ў музеі, рарытэтная мэбля захоўвалася ў звычайнай камуналцы.

**«Сядзець у музеі і чакаць, пакуль прыйдуць наведвальнікі, — гэта не выйсце».**

Цікава, што ў Піцер гэта мэбля магла трапіць з... Блоні (дзе знаходзіцца цяпер). На Пухавіччыну ж, верагодна, яе маглі прывезці з Крыма. Адтуль паходзіла жонка Глеба Бонч-Асмалоўскага. Яна была актрысай, яе бацька працаваў рэктарам мясцовага ўніверсітэта — таму мелася магчымасць перадаць маладой дыхтоўна зробленыя прадметы для інтэр'ера.

### 220 АЎТОГРАФАЎ НА ПАМЯЦЬ

Рарытэтныя прадметы мэблі — не адзіны гонар Пухавіцкага музея. Дырэктар адзначае, што ёсць у іх экспазіцыя, прысвечаная Якубу Коласу, зробленая пры непасрэдным удзеле яго сына Міхася Міцкевіча. Ёсць асобны збор пад назвай «Літаратурная Пухавіччына», у якім захоўваюцца звесткі пра мясцовых пісьменнікаў. Не менш каштоўным падаецца літаратурны пакой Алеся Бачылы. У ім сабраны кнігі з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў, якія падпісвалі і дарылі гэтаму аўтару свае выданні. Алесь Бачыла сябраваў з Піменам Панчанкам, Нілам Гілевічам, Максімам Танкам і многімі іншымі. У пачатку 2000-х гадоў яго сын Барыс прапанаваў аддаць бібліятэку бацькі. Частка выданняў пайшла ў Зазерскую сельскую бібліятэку, а найбольш каштоўныя — больш за 220 кніг з даравальнымі надпісамі аўтараў — у музей. Таксама Барыс Бачыла перадаў асабістыя рэчы бацькі, дакументы, фота.

У музеі ў Блоні змяшчаюцца адметныя музычныя інструменты — тыя, што вырабіў самадзейны кампазітар і майстар Усевалад Жукоўскі. Ён валодаў незвычайным талентам і сам рабіў скрыпкі, беларускія цымбалы, ліры, дудкі. На яго інструментах igралі «Песняры», імі карыстаўся аркестр усесаюзнага радыё і тэлебачання.

### ЦІ ВЕДАЮЦЬ ПАРЫЖАНЕ, ДЗЕ ЛУЎР?..

Акрамя пералічаных экспазіцый, у Пухавіцкім краязнаўчым музеі можна ўбачыць яшчэ шмат займальнага, напрыклад экспазіцыі «Знакамітыя людзі краю», «У гады ліхалецця», «Народны побыт»... Мае музей і чатыры філіялы, сярод якіх мастацкая галерэя ў Мар'інай Горцы. Аднак Аляксандр Пpановіч упэўнены, што нельга супакойвацца на дасягнутым і лічыць сваю музейную справу зробленай. «Я не прыхільнік таго, каб музей быў статычным, каб заўсёды паказвалася адно і тое ж, — кажа дырэктар. — Экспазіцыя павінна пастаянна абнаўляцца, дапаўняцца. Бо калі адзін раз паглядзелі — на наступны ўжо можа быць нецікава. Хоць і складана, мы імкнёмся абнаўляць свае выставы, ствараем спецыяльныя музейна-адукацыйныя праграмы... Сядзець у музеі і чакаць, пакуль прыйдуць наведвальнікі, — гэта не выйсце». Супрацоўнікі самі выязджаюць у школы, арганізоўваюць там музейныя ўрокі, выставы, сустрэчы з цікавымі людзьмі.



У якасці прыкладу выдатнай музейнай працы Аляксандр Пpановіч узгадаў абноўленую экспазіцыю ў музеі Янкі Купалы. Там шмат што паказваецца віртуальна. Экскурсавод носіць з сабой планшэт. А па сцяне нібы ходзіць жывы Янка Купала і чытае свае творы, урыўкі з лістоў. Дзякуючы такой падачы ўдаецца акунуцца ў асяроддзе мінулага часу, адчуць дух паэта і яго слова.

Аднак не ўсё залежыць ад якасці экспазіцыі і яе падачы, лічыць дырэктар: «Дзеці заканчваюць школы, а далей у іх ужо зусім іншыя інтарэсы — ці многія з іх у сталым узросце працягваюць наведваць музей?.. Не думайце, што ў Парыжы шмат парыжан ходзіць у Луўр. Спытайце ў француза, дзе ён знаходзіцца, — могуць і не ведаць. У Мінску, напрыклад, не ўсе гараджане адкажуць, дзе знаходзіцца Нацыянальны мастацкі музей. Так і ў нас, таму наведвальнікаў даводзіцца прывабліваць».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*Пухавіцкі раён*

**БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ**

# САМЫ ЦЫМУС

**Хто не ведае гэтага выразу — «самы цымус»? Часта ўжываем яго, не задумваючыся, маючы на ўвазе нешта важнае, прывабнае і прыемнае ў нейкай рэчы або справе: «тое, што трэба», «самае тое», «самае лепшае».**

Гістарычна гэты выраз азначае «самае смачнае». Бо слова «цымус» паходзіць з мовы ідыш і напачатку датычылася вельмі распаўсюджанай у кухні яўрэяў-ашкеназі стравы, якая гатуецца з розных відаў агародніны, садавіны, часта з дадаткам мяса. Але нават і з мясам яна мае салодкі смак, згодна з кулінарнымі звычаямі Блізкага Усходу.

На мове ідыш гучыць хутчэй «цымес», чым успрыняты беларусамі на слых «цымус». Tzimmes у ідыш — гэта злучэнне двух слоў: tzim (да, для) і esn (есці, ежа). Так што даслоўнае тлумачэнне нават вельмі банальнае: «да ежы», «закуска». Дарэчы, прыкладна тое самае азначае і слова «фаршмак», але яно чамусьці ўжываецца ў дачыненні зусім да іншай ежы. Так можна было б назваць увогуле любую страву, а не толькі святочны дэсерт, салодкае рагу з агародніны, садавіны і мяса. Чаму вядомы нам цымус называецца менавіта гэтым словам, яшчэ належыць высветліць кулінарным гісторыкам.

Яўрэі Беларусі і ўвогуле Рэчы Паспалітай ці не найчасцей гатавалі цымес з морквы. Апроч пасіраванай морквы, у ім маглі быць усюдыісная бульба, памідоры, яблыкі, фасоля і іншыя кампаненты. Хоць і заўжды салодкі, цымес мог быць як дэсертам, так і галоўнай стравай (асабліва калі з мясам).



У яўрэйскім фальклоры нарэзаныя ўпоперак колцы морквы здаўна асацыяваліся з залатымі манетамі, таму цымес з морквы, глазураванай мёдам, часта елі як рытуальную страву на Рош-ха-Шана (Новы год паводле яўрэйскага календара). Яго сімвалізавалі з дабрабытам, якога такім чынам зычылі ўсім удзельнікам святочнай вячэры. Маглі гатаваць цымес і на іншыя святы, але абавязкова на радасныя, а не жалобныя — напрыклад, на Пэсах. Так што, магчыма, нават не так сам смак цымесу-цымусу, колькі яго сімвалізм, прывялі да пераасэнсавання гэтага слова і надання яму новага значэння, якое пашырылася ў беларускай, украінскай, польскай і нават часткова ў рускай мове.

Цікава, што пераноснае значэнне, шырока вядомае ва ўсёй Усходняй Еўропе, за акіянам змянілася. У амерыканскім жаргоне Tzimmes азначае не тое, што ў нас, але нешта накшталт — «сумятня», «клопат», «амбарас». Бо лічыцца, што страва гэтая досыць працаёмістая, з ёй звязана шмат клопату, сямейнай балбатні і ледзь не сварак. А часам беларускія сяляне, калі кпілі са сваіх яўрэйскіх суседзяў, з іроніяй, а можа, і наракаючы на сваю цяжкую долю, называлі «цымусам»... гной — той самы, што раскідваюць віламі...

Магчыма, што не менш распаўсюджаным быў некалі варыянт цымесу — не з морквы, а з мяса (вядома, толькі з кашэрнага, напрыклад, ялавічыны) і сушаных сліў. Кажуць, што асабліва папулярны ён сярод яўрэяў Паўднёвай Афрыкі — а тамтэйшая грамада з пэўных гістарычных прычын ледзь не на 90% складаецца з нашчадкаў «літвакоў» — выхадцаў з Літвы і паўночнага захаду Беларусі. Так што калі там цымус дагэтуль гатуюць пераважна так, дык, магчыма, і на радзіме продкаў паўднёваафрыканскіх яўрэяў яго калісьці так гатавалі. Шкада, што акурат у нашай частцы былой гістарычнай Літвы яўрэяў амаль не засталося. Таму распытаць няма каго, а запісаў пра іх традыцыйную кухню засталося мала або яны цяжка даступныя. Ну, а ўвогуле варыянтаў цымесу ў розных краінах і рэгіёнах вядома шмат. Напрыклад, у Галіцыі цымес — гэта найперш яблык, запечаны ў цесце з разынкамі і цынамонам або нешта накшталт велікоднай бабкі або нават пудынгу.

Хацелася б мець магчымасць дзе-нідзе ў сучасных беларускіх рэстаранах пакаштаваць цымесу-цымусу, які цалкам можна лічыць не толькі яўрэйскай, але, у тым ліку, і беларускай стравай. Але нашы рэстаратары пакуль не такія вынаходлівыя ці, хутчэй, спажыўцы не вельмі патрабавальныя і абазнаныя ў айчыннай гісторыі і культуры.

### ЦЫМЕС ЯК ГАРНІР

Рэцэпт з кнігі Алеся Белага «Belarusian Cookbook»

*(адаптаваны пад амерыканскіх хатніх гаспадыняў, адсюль колькасць прыводзіцца шклянках)*



**Складнікі:** *4 шклянкі морквы (нарэзанай кубікамі або «манеткамі»), 3/4 шклянкі ачышчаных яблыкаў, нарэзаных кубікамі, 1 ст. лыжка «панцаку» (ячменных крупаў), 3 ст. лыжкі масла (несалёнага), 1/2 лыжачкі солі, 2 лыжачкі мёду або цукру, 1/4 лыжачкі мускатнага арэху.*

**Прыгатаванне:** Складзіце ўсе інгрэдыенты ў вялікі рондаль, дадайце 1/4 шклянкі вады, давядзіце да кіпення. Паменшыце агонь да вельмі слабага і тушыце каля 1 гадзіны, часта памешваючы і дадаючы, па меры выкіпання, яшчэ 2 або 3 лыжкі вады. Сачыце, каб не падгарэў. Падавайце як гарнір да страў з варанага або сушанага мяса. Рэцэпт на 4-6 асоб.

# ДЗЕ ЛЕТУЕ БАТЛЕЙКА?

**ПАКУЛЬ навукоўцы думаюць над тым, які гістарычны артэфакт варта зрабіць новым беларускім брэндам, якому ўнікальнаму майстэрству пасля адраджэння вырабу слуцкіх паясоў даць другое жыццё, нашы творцы разам са сваімі выхаванцамі адраджаюць, працягваюць напаўзабытыя, але ж такія вабныя народныя традыцыі, тое, што сапраўды можа заінтрыгаваць не толькі нас, але і нашых замежных гасцей. Пра батлейку, гэты таемны калядны лялечны тэатр, звычайна згадваюць узімку. Ведаю, што ў музеях ладзяць выстаўкі, калядныя паказы, маладыя мастакі робяць свае сучасныя інтэрпрэтацыі... Але ж куды знікаюць батлеечныя героі па вясне? Дзе летуе батлейка?**



Сёлета вясною Музей старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук Беларусі запрасіў да сябе батлейку, што зімавала разам з юнымі майстрамі — вучнямі 7 класа, у гімназіі-каледжы мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка, дзе вучацца таленавітыя дзеці з усёй рэспублікі. Сямікласнікі разам з выкладчыцай, слыннай беларускай мастачкай Аленай Піскун зрабілі на занятках лялькі і наладзілі батлеечныя паказы. У музеі шмат унікальных экспанатаў, але вітрыны з лялькамі, якія ў адпаведнасці з усімі традыцыямі вырабілі вучні, глядзяцца адметна. Ад іх зыходзіць асаблівая моцная энергетыка адкрыцця. Бо, вырабляючы ляльку, кожны з юных мастакоў вывучаў даўнейшыя аналагі, дакранаўся да мінулага і аднача́сова ажыўляў яго для дня сённяшняга і будучыні. Эксперымент удаўся. І на адкрыцці выставы гэта адзначыў дырэктар музея старажытнабеларускай культуры, наш слынны навукоўца Барыс Лазука, пад кіраўніцтвам якога якраз і адраджалі выраб слуцкіх паясоў. Супрацоўнікі музея не ўтрымаліся і, перш чым размясціць лялькі ў вітрынах, разыгралі з імі спектакль.

**А мы наракаем, што дзеці, падлеткі сталі палоннікамі віртуальных гульняў! Можа, проста з імі побач няма тых, хто заінтрыгуе сапраўднымі, а не віртуальнымі артэфактамі.**

Алена Піскун, пад кіраўніцтвам якой здзяйсняўся праект, выдатна ведае народныя традыцыі. Яна не толькі вядомы далёка за межамі Беларусі жывапісец. Разам са сваім мужам, мастаком Юрыем Піскуном, распрацоўвала першыя касцюмы для ансамбля «Харошкі». Яна выхавала трох дачак, якія таксама скончылі гімназію-каледж мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка, пасля Беларускую акадэмію мастацтваў. Старэйшая Вольга — выдатны жывапісец, Соф'я — арыгінальны графік, а малодшая Валянціна працуе мастаком у ансамблі «Харошкі».

У кожнага з батлеечных герояў, якіх зрабілі юныя мастакі, свой характар, свой рукатворны, густоўна зроблены касцюм.

Нагадаем, што батлеечныя паказы, якія ладзіліся на Каляды, — гэта не толькі сцэны з Бібліі, але і вясёлыя сцэнкі з вясковага жыцця; гэта той выпадак, калі побыт можна ўспрымаць як філасофію быцця.

За кожным з персанажаў, што застылі ў вітрынах музея, — маленькае адкрыццё, зробленае юным мастаком.

— Для таго, каб зрабіць Пісьменніка, — расказвае Марыя Зленка, — спачатку трэба было ўзяць дзве палкі: адну даўжэйшую — для цела, другую карацейшую — для плячэй. Пасля выбраць адзенне, а дакладней тканіну. Потым прымацаваць з дапамогай скотча скамячаную паперу, наклеіць пап'е-машэ на галаву і цела. Рукі я рабіла з ніткі са скотчам на канцах, куды таксама наляпіла пап'е-машэ. Калі лялька высахла, я ўзяла пэндзлі (вялікі — для цела, тонкі — для твару) і пачала размалёўваць. На твары было шмат дробных дэталяў — вочы, вушы, барада, вусы, бровы, нос і рот. Мне хацелася, каб ён выглядаў мудрым чалавекам. Потым я пашыла па памеры адзенне — карычневую світу, і апранула майго Пісьменніка. На галаве ў яго капялюш, у руках — кніга з пяром. Мне здаецца, што гэта было самае захапляльнае з усіх заданняў.

Кожны з вучняў натхнёна расказваў пра сваіх герояў: Даша Васілеўская — пра Казака, Паліна Палішук — пра Смерць, Даніiл Дземідовіч — пра Цыгана, Паліна Герман — пра Яўрэя. Ганна Якубовіч шукала мадэлі адзення для сваёй Салохі ў інтэрнэце. Вераніка Шалухіна апранула Бабу Антоніху ў дакладна адноўлены народны строй. Вера Маланава адкрыла, што Чорцік падобны да ката і меншы за ўсіх герояў «Цара Ірада»...

**Вырабляючы ляльку, кожны з юных мастакоў вывучаў даўнейшыя аналагі, дакранаўся да мінулага і аднача́сова ажыўляў яго для дня сённяшняга і будучыні.**

А мы наракаем, што дзеці, падлеткі сталі палоннікамі віртуальных гульняў! Можа, проста з імі побач няма тых, хто заінтрыгуе сапраўднымі, а не віртуальнымі артэфактамі, дасць магчымасць дакрануцца да жывой гісторыі? Жывая гульня, жывыя зносіны з людзьмі, няхай і праз лялечных герояў, — вось тое, чаго так не хапае сёння і дзецям, і дарослым. Народныя вобразы, у якіх закладзены не толькі архетыпы нашага светаўспрымання, але, мяркую, і архетыпы нашай ментальнасці, могуць дапамагчы вырашыць некаторыя псіхалагічныя праблемы лепш за псіхатэрапеўтаў.

**Галіна БАГДАНАВА.**

# Информация о проведении аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

| | |
|---|---|
| ЛОТ № 1 | |
| Адрес объекта и его наименование | **Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Азарки-Пудовинка, ул. Озерная, площадью 0,1914 га (кадастровый номер 624083100601000088). Начальная цена 50 000 000 (Пятьдесят миллионов) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| ЛОТ № 2 | |
| Адрес объекта и его наименование | **Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Гатовичи, ул. Центральная, площадью 0,2289 га (кадастровый номер 624083103601000247). Начальная цена 120 000 000 (Сто двадцать миллионов) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| ЛОТ № 3 | |
| Адрес объекта и его наименование | **Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Шиковичи, площадью 0,2015 га (кадастровый номер 624083111601000104). Начальная цена 50 000 000 (Пятьдесят миллионов) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| Порядок оплаты | Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации, с потерями сельскохозяйственного производства. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. |
| Продавец | Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Документы, представляемые для участия в аукционе | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10% от начальной цены на р/с 3641061900110 ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601 г. Молодечно, код 769, УНН 600380436, код платежа 04901. |
| Конечный срок и адрес приема заявок | **23 июня 2014 г. до 16.00,** г. Мядель, ул. 17 Сентября, 7, каб. 16, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел.: (факс) (8-01797) 55-7-35, (8-1797) 55-7-36 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **26 июня 2014 г. в 14.00** г. Мядель, ул. 17 Сентября, 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет |

# УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## 25 июня 2014 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Озерский с/Совет | аг. Озеро, ул. Жасминовая, № 1 | 0,1500 | 625682508601000847 | 69 000 000 | 7 098 200 |
| Лот № 2 | Озерский с/Совет | аг. Озеро, ул. Жасминовая, № 2 | 0,1500 | 625682508601000846 | 69 000 000 | 7 098 200 |
| Лот № 3 | Озерский с/Совет | аг. Озеро, ул. Жасминовая, № 3 | 0,1500 | 625682508601000845 | 69 000 000 | 7 098 200 |
| Лот № 4 | Озерский с/Совет | аг. Озеро, ул. Жасминовая, № 4 | 0,1500 | 625682508601000844 | 69 000 000 | 7 098 200 |
| Лот № 5 | Озерский с/Совет | аг. Озеро, ул. Жасминовая, № 5 | 0,1500 | 625682508601000843 | 69 000 000 | 7 098 200 |
| Лот № 6 | Озерский с/Совет | аг. Озеро, ул. Жасминовая, № 6 | 0,1500 | 625682508601000842 | 69 000 000 | 7 098 200 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению

## На повторные торги выставляются:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 7 | Слободской с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 15 | 0,0987 | 625683205601000085 | 50 000 000 | 6 603 200 |
| Лот № 8 | Слободской с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 17 | 0,0912 | 625683205601000086 | 50 000 000 | 6 603 200 |
| Лот № 9 | Слободской с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 19 | 0,0918 | 625683205601000087 | 50 000 000 | 6 603 200 |
| Лот № 10 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. Академика Бокутя, уч. № 7 | 0,1110 | 625650100002000251 | 55 000 000 | 4 851 350 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Участки в д. Кривели находятся в живописном месте рядом с Лошанским водохранилищем, имеется возможность подключения к электроснабжению и водоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа – 04901.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням до 19 июня 2014 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;
- копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by** либо по телефонам: **(801718) 65404, 54705, 65338.**

# ОАО «Нафтан»

## РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ

(с повышением начальной цены)

**бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

| Наименование конкурса (пометка на конверте) | Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| 1. Реализация неликвидов. Прицеп тракторный | Прицеп тракторный ПСЕ-Ф, гос. № 7823 ВМ | 06250880 | 1992 | 10 800 000 |
| 2. Реализация неликвидов. Легковой транспорт | ВИС-2345, гос. № 8893 ВТ | 13150610 | 2001 | 17 280 000 |
| | ВИС-2345, гос. № ВЕ 6920 | 13150611 | 2002 | 17 280 000 |
| | ВАЗ-21093, гос. № 8867 ВТ | 13150599 | 2002 | 18 360 000 |
| | ВАЗ-21093, гос. № 8850 ВТ | 13150603 | 2002 | 18 360 000 |
| | ВАЗ-21093, гос. № 8856 ВТ | 13150602 | 2002 | 18 360 000 |
| | ВАЗ-21093, гос. № 9547 ВТ | 13150649 | 2003 | 18 360 000 |
| | ВАЗ-210430, гос. № 9061 ВТ | 13150654 | 2003 | 26 520 000 |
| | ВАЗ-21104, гос. № 5047 АК-2 | 13150717 | 2005 | 22 440 000 |
| | Шевроле Нива 212300, гос. № 1843 АК-2 | 13150711 | 2005 | 69 120 000 |
| | Тойота Ленд Крузер, гос. № 9810 ВТ | 13150565 | 2000 | 180 360 000 |
| | Тойота Ленд Крузер, гос. № 8483 ВТ | 13150511 | 1997 | 178 200 000 |
| 3. Реализация неликвидов. Автотехника | ГАЗ-2752, гос. № АА 5915-2 | 13150782 | 2006 | 38 880 000 |
| | Мерседес Бенц 2636 (седельный тягач), гос. № АВ 0696-2 | 13150127 | 1989 | 162 000 000 |

Состояние удовлетворительное.

